ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 7 (1126) | Серада, 23 студзеня 1957 года | Цана 40 кап.

Насустрач выбарам у мясцовыя Советы

Працоўныя рэспублікі рыхтуюцца да дня выбараў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных. На прадпрыемствах, ва ўстановах, у клубах і хатах-чытальнях арганізуюцца выстаўкі, прысвечаныя гэтай знамянальнай падзеі ў жыцці беларускага народа. На выстаўках — выбарчая літаратура: брашуры аб правах выборшчыкаў, артыкулы і прамовы відных дзеячоў Комуністычнай партыі і Совецкага ўрада.

Да дня выбараў Дзяржаўнае выдавецтва БССР рыхтуе плакаты і брашуры.

Масавымі тыражамі выдаюцца «Палажэнне аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР», «Канстытуцыя БССР».

На здымку: плакат мастака **П. Калініна**, які будзе выдадзены да выбараў.

Выяўленчае мастацтва служыць народу

Разам з літаратурай, тэатрам, музыкай і кіно будзе дэманстраваць свае поспехі ў сёлетнім юбілейным годзе і выяўленчае мастацтва Беларусі. Калі-б можна было экспанаваць усё, створанае нашымі мастакамі за сорак год совецкай улады, на гэта спатрэбілася-б некалькі карцінных галерэй. Кастрычніцкая рэволюцыя адкрыла шырокую дарогу мастацкім талентам народа, і ўжо з першых год рэволюцыі ў Беларусі пачалося дзейнае мастацкае жыццё.

Развівалася яно, вядома, не лёгка і не проста. Рэалістычная плынь маладога беларускага мастацтва часам з цяжкасцю прабівалася праз фармалістычныя, імпрэсіяністычныя, дэкадэнцкія напластаванні. Тым не менш жыватворны струмень соцыялістычнага рэалізма развіваўся ўсё шырэй і шырэй і праз некалькі год стаў пануючай плынню.

Сістэматычныя выстаўкі, якія зрабіліся неад'емнай часткай мастацкага жыцця рэспублікі, паказвалі, што выяўленчае мастацтва набірае паступовы, але шырокі размах. Але фашысцкія акупанты разграбілі і знішчылі беларускую карцінную галерэю, і да сённяшніх дзён, на вялікі жаль, дайшло вельмі мала даваенных твораў беларускіх мастакоў.

У пасляваенны перыяд жывапісцы, скульптары, графікі яшчэ з большай энергіяй узяліся за стварэнне новых палотнаў, скульптур, кампазіцый. Пачалася новая старонка беларускага выяўленчага мастацтва, якое штогод узбагачалася цікавымі і яркімі творамі. З году ў год разрасталіся памеры справаздачных выставак, бо павялічвалася і колькасць экспанатаў, і колькасць іх удзельнікаў. У апошні час стала ўжо немагчымым экспанаваць на адной выстаўцы ўсё створанае за год. Пачалі наладжвацца абласныя, раённыя, індывідуальныя выстаўкі.

Цяпер у поўным разгары творчая падрыхтоўка мастакоў да юбілейнай выстаўкі. Міністэрствам культуры БССР, Галоўным упраўленнем выяўленчых мастацтваў культуры СССР і Беларускім аддзяленнем Мастацкага фонда заключана больш 130 дагавораў з жывапісцамі, скульптарамі і графікамі рэспублікі. Ім прапанаваны шырокі і разнастайны тэматычны план. Некаторыя мастакі далі свае творчыя заяўкі. У секцыях Саюза мастакоў і ў выставачным камітэце прайшлі абмеркаванні эскізаў будучых палотнаў і скульптур.

Ужо цяпер можна адзначыць цікавыя і важныя тэмы, якія пры майстэрскім выкананні могуць стаць тымі творамі, што дастойна азнаменуюць юбілейную дату Вялікага Кастрычніка. Гэта кампазіцыі «Сустрэча В. І. Леніна на Фінляндскім вакзале» А. Шыбнёва, «Паўстанне на возеры Нарач» В. Цвіркі, «1917 год у Мінску» Н. Воранава, «Дэкрэт аб зямлі і міры» Л. Рана, «Уступленне ў калгас» П. Брохалева, «За дапамогай да партызан» В. Жаўток, «На баявой аперацыі» («Канстанцін Заслонаў») Я. Зайцава і інш. Мастакі І. Ахрэмчык, Н. Гусеў, А. Бембель, Я. Зайцаў, Х. Ліўшыц працуюць над жывапіснымі і скульптурнымі партрэтамі перадавікоў прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Акрамя таго, І. Ахрэмчык і І. Давідовіч прадстаўляюць на выстаўку эскізы манументальных роспісаў памяшканняў тэатра юнага гледача і Беларускага таварыства культурнай сувязі з заграніцай.

Рад мастакоў працуе ў нарадку сустрэчных прапаноў. Так, З. Азгур працуе над скульптурнай кампазіцыяй, прысвечанай В. І. Леніну, і над фігурай М. В. Фрунзе. Мастакі В. Цвірка, В. Жаўток, Г. Азгур пішуць пейзажы, нацюрморты і г. д.

Выставачныя камітэты СССР і БССР далі станоўчую ацэнку падрыхтоўчай рабоце беларускіх мастакоў да Усесаюзнай і рэспубліканскай юбілейных выставак. Можна і трэба спадзявацца, што нашы мастакі сапраўды зробяць сваю выстаўку вялікай культурнай падзеяй і далёка рушаць наперад беларускае выяўленчае мастацтва.

Трэба разам з тым мець на ўвазе, што выстаўка ў гэтым годзе будзе асабліва адказнай. Крытэрыі высокай ідэйнасці і майстэрства будуць асноўнымі і рашаючымі.

Таму на выстаўцы не знойдуць месца кан'юнктурная творчасць, халоднае рамеснічтва, творы, не сагрэтыя гарачым сэрцам мастака-патрыёта, мастака-мысліцеля і грамадзяніна. Мала зрабіць толькі заяўку на «вядучую» тэму, неабходна яшчэ падмацаваць яе ўласнай унутранай патрэбай, патрэбай выказаць гэтую тэму ўсім сваім сэрцам.

Рэспубліканскі выставачны камітэт зрабіў-бы, відаць, больш правільна, каб спачатку заахвоціў мастака прыйсці са сваёй заяўкай, з той задумай, якую ён выконвае, якая хвалюе яго.

Гэта ніколькі не парушыла-б тэматычнае аблічча будучай выстаўкі, бо выставачны камітэт мае права **выбіраць і рэгуляваць заяўкі.**

Але сустрэчных заявак у плане заказаў пакуль што вельмі мала. Гэта, вядома, не азначае, што многія тэмы з плана, прапанаванага выставачным камітэтам, не маглі супасці з сапраўднымі імкненнямі мастакоў. Такіх супадзенняў ёсць, відаць, нямала.

Многія мастакі працуюць над вобразамі партыйных і дзяржаўных дзеячоў, вобразамі перадавых людзей рэспублікі, што трэба адзначыць як вельмі пажаданую і радасную з'яву. Але трэба мець на ўвазе, што сёння ўжо нельга задаволіцца толькі адным партрэтным падабенствам, эфектнай позай, калі ў створаным вобразе не будзе душы, таго індывідуальна асаблівага, уласцівага толькі таму ці іншаму чалавеку, калі не будзе самага галоўнага—свайго падыходу да тэмы і яе раскрыцця.

Самая сур'ёзная ўвага павінна быць звернута на майстэрства, якое з'яўляецца пакуль што слабым месцам яшчэ многіх нашых мастакоў. Можна ўзяць вялікую па сваёй ідэйнай значнасці тэму, але, калі ў мастака нестае майстэрства — яна застанецца толькі добрым намерам, а не мастацкім творам. Гэта—аксіёма, тым не менш яе даводзіцца зноў паўтараць, бо многія індывідуальныя і калектыўныя выстаўкі ў мінулым годзе прымушалі ўспамінаць яе.

Адной з вялікіх выставак мінулага года была экспазіцыя пейзажаў мінскіх мастакоў. У прэсе адзначалася ўжо, што на гэтай выстаўцы не задавальняла іменна майстэрства пераважнай большасці пейзажаў. Умоўнасць, прыблізнасць натуры, тэхнічная недасканаласць, а то і проста тэхнічная неахайнасць намнога знізілі ўражанне ад гэтай выстаўкі.

Не усе яшчэ мастакі добра валодаюць сюжэтнай кампазіцыяй, уменнем распрацаваць другі план карціны, карыстацца дэталлю і г. д.

Усё гэта неабходна, калі па эскізу робіцца карціна або скульптура. А нярэдка бывае, што пры гэтым у мастака не хапае майстэрства і карціна бывае горшай за сваю задуму.

У выставачным камітэце і Саюзе мастакоў адчуваецца цяпер некаторая заспакоенасць, паколькі большасць прадстаўленых эскізаў атрымала станоўчую ацэнку. Але эскіз—яшчэ не закончаны твор, і сам па сабе ён не вырашае поспеху карціны або скульптуры. Таму Саюзу мастакоў і асабліва яго секцыям варта было-б падумаць над формамі дапамогі мастакам, пакуль яны яшчэ працуюць над сваімі творамі, каб папярэдзіць магчымыя зрывы, уласную непатрабавальнасць і заспакоенасць на дасягнутым. Самы складаны і рашаючы этап пачнецца якраз цяпер, калі многія мастакі прыступілі да пераводу сваіх эскізаў у натуру.

Наогул у справе падрыхтоўкі да выстаўкі не можа быць ніякай заспакоенасці, паколькі яшчэ трэба многа зрабіць як выставачнаму камітэту, так і Саюзу мастакоў. Нельга, напрыклад, прызнаць нармальным, што з агульнай і даволі вялікай колькасці дагавораў з мастакамі толькі пяць-шэсць прыпадаюць на мастакоў абласных цэнтраў. А там, між іншым, ёсць не так ужо мала таленавітых людзей, якія маглі-б узбагаціць сваімі творамі юбілейную выстаўку. Але Саюз мастакоў вельмі мала дапамагае ім у паляпшэнні творчых і бытавых умоў, сістэматычнай прафесіянальнай кансультацыяй, у якой перыферыйныя мастакі маюць асаблівую патрэбу.

Яшчэ горшая справа з падрыхтоўкай да выстаўкі самадзейных жывапісцаў, графікаў, скульптараў, разбіроў, інкрустатараў, вышывальшчыц. Штогодныя раённыя і абласныя выстаўкі іх творчасці сведчаць аб велізарным росце народных талентаў, якія ствараюць непаўторныя ўзоры сапраўды народнага мастацтва.

І можа не варта было-б змяшчаць гэтыя ўзоры ў адзін нейкі раздзел агульнай мастацкай выстаўкі. Самадзейная творчасць мае ўсе падставы экспанавацца на асобнай, спецыяльнай выстаўцы народнага мастацтва, якая можа застацца асновай рэспубліканскага музея народнай творчасці.

У гэтым годзе, нарэшце, трэба вырашыць даўным-даўно наспеўшую праблему прапаганды беларускага выяўленчага мастацтва. Трэба зрабіць так, каб з лепшымі творамі жывапісу, графікі і скульптуры знаёмілася як мага больш людзей. Выстаўкі, якія штогод бываюць у Мінску, не вырашаюць гэтую задачу. Па-першае, яны арганізоўваюцца так дрэнна, што аб іх мала хто ведае, а па-другое, пакуль яны павінны быць толькі прывілеяй Мінска? Калі іх, нарэшце, убачаць у абласных, раённых цэнтрах, у сельскіх і калгасных клубах? У свой час у Міністэрстве культуры ўзнікла ідэя перасоўных выставак, але непаваротлівыя і безініцыятыўныя людзі выставілі столькі розных довадаў супраць гэтай ідэі, што яна памерла, не паспеўшы нарадзіцца. І на працягу многіх год нашы мастакі маюць вельмі ўжо мізэрны кантынгент гледачоў, а ў шырокіх народных масах многіх з іх проста не ведаюць, таму што не маюць магчымасці бачыць іх творы. Рэспубліканская выстаўка ў Мінску павінна адкрыцца ў чэрвені—ліпені гэтага года. Ёсць усе магчымасці, каб да лістапада, да юбілейнага свята, яе можна было паказаць у абласных і раённых цэнтрах. Не абавязкова, між іншым, паказваць на перасоўных выстаўках толькі тыя творы, якія будуць экспанаваны на юбілейнай выстаўцы. Можна арганізаваць цэлы рад перасоўных выставак з твораў мінулых гадоў, якія маюць пэўную мастацкую каштоўнасць, бо ўсё роўна іх не ведаюць на перыферыі. Не менш важным было-б наладзіць выпуск манаграфій аб выдатных мастаках рэспублікі, масавы выпуск рэпрадукцый і г. д.

Кіно, тэатры, філармонія, эстрада пранікаюць усё глыбей і глыбей у самыя далёкія населеныя пункты. Чаму-ж у гэтай справе выяўленчае мастацтва павінна быць выключэннем, калі яно хоча стаць сапраўды народным? А іншым яно і не можа быць. Некаторыя цяжкасці, звязаныя з арганізацыяй перасоўных выставак, трэба ўмела пераадолець, маючы на ўвазе, што ўсе працоўныя маюць права карыстацца культурнымі дасягненнямі сваёй, і не толькі сваёй, рэспублікі.

У сувязі з гэтым вельмі важна было-б пазнаёміць працоўных Беларусі з дасягненнямі мастакоў і брацкіх рэспублік. Чаму-б у гэтым годзе не арганізаваць абменныя выстаўкі з Ленінградам, Украінай, Літвой, Латвіяй і іншымі брацкімі рэспублікамі?

Некалькі гадоў назад беларуская мастацкая выстаўка была паказана ў Літве. Літоўскія мастакі адкрыта і шчыра сказалі, што добра і што дрэнна ў творчасці нашых жывапісцаў і графікаў, і гэта прынесла толькі карысць.

Што-ж перашкаджае і цяпер вывозіць нашы творы за межы Мінска, за межы рэспублікі?

Беларускія мастакі жывуць пакуль што вельмі замкнута, цэхавымі інтарэсамі. Юбілейны год павінен стаць пераломным не толькі ў павышэнні ідэйна-мастацкай значнасці іх творчасці, а і ў тым, каб іх творы пранікілі ў народныя масы, сталі-б сродкам ідэйнага і эстэтычнага выхавання.

ЭНТУЗІЯСТЫ КУЛЬТУРНАЙ РАБОТЫ

★ ★

Лепшы кіномеханік рэспублікі

Шмат марыў Яўген Крывец аб прафесіі кіномеханіка. А калі ў яго родную вёску Галавачы прыязджала кінопересоўка, ён падоўгу прастойваў каля яе і з захапленнем сачыў, як спрытна працаваў ля апарата юнак у камбінезоне. У хуткім часе кіномеханікі прывыклі, што каля іх заўсёды завіхаецца цікаўны хлапчук, і пачалі дазваляць яму выконваць прасцейшыя работы.

У той час Яўген Крывец заканчваў сёмы клас. І вось, параіўшыся з бацькамі, ён рашыў стаць кіномеханікам.

Яшчэ праз год ён паспяхова скончыў Гродзенскую школу кіномеханікаў і цяпер самастойна працуе ў Скідзельскім раёне.

— Цяжка было працаваць першы час, —гаворыць ён,— не хапала практычных навыкаў, але духам не падаў. Выпісаў часопіс «Кіномеханік».

Цяпер Яўген Крывец абслугоўвае Дубноўскі і Русіноўскі сельсоветы. Для рэгулярнага кінаабслугоўвання ўсіх населеных пунктаў распрацаваны графік, кожны месяц складаецца заяўка на кінакарціны з улікам пажаданняў гледачоў. Так, напрыклад, вучні Дубноўскай сярэдняй школы жадалі глядзець больш дзіцячых кінафільмаў. Цяпер для іх заўсёды дэманструюцца фільмы ўдзень.

Колькасць гледачоў у многім залежыць ад рэкламіравання. Гэта таксама добра ведае Яўген Крывец. Раніцай таго дня, калі намечана даваць сеанс, у вёсцы вывешваюцца аб'явы. Іх піша сам Яўген і стараецца рабіць гэта з густам. Кіномеханік з'яўляецца добрым актывістам. Перад пачаткам сеансаў ён праводзіць гутаркі з гледачамі, цікавіцца іх запатрабаваннямі.

За чатыры гады работы Яўген Крывец навучыў сваёй прафесіі трох матарыстаў, якія працуюць цяпер самастойна кіномеханікамі.

Яго цяперашні матарыст Уладзімір Сало таксама пераймае вопыт у Яўгена і рыхтуецца да здачы экзамену.

Надаўна Міністэрства культуры БССР выдала Я. Крыўцу пасведчанне і значок «Лепшы кіномеханік рэспублікі».

І. КРЫШАЛОВІЧ.

Кнігі нашых сяброў

Каму даводзілася бываць у кнігарні № 11, што на рагу вуліц Карла Маркса і Фрыдрыха Энгельса ў Мінску, той не мог не заўважыць ля аднаго з прылаўкаў многа людзей. Усіх іх цікавяць кнігі, выдадзеныя ў краінах народнай дэмакратыі.

Вучань сёмай сярэдняй школы Уладзімір Вайніла просіць, каб яму прадалі кнігу Яніны Бранеўскай на польскай мове. Прафесар тав. Фурсенка жадае набыць кнігі па геалогіі і медыцыне на нямецкай мове. Выкладчыкі інстытута замежных моў тт. Мартыноўскі і Шыманскі цікавяцца творамі нямецкіх класікаў. Адзін з пакупнікоў разглядае кнігу на кітайскай мове. Студэнтка Беларускага дзяржаўнага універсітэта тав. Новікава пытае, ці ёсць кнігі Івана Вазава на балгарскай мове. Пачынаючы кампазітар тав. Анчыкаў гартае творы вялікага польскага кампазітара Шапэна.

Прадаўшчыца Людміла Сарнова чула і ўважліва ставіцца да кожнага наведвальніка.

Знайсці шлях да сэрца кожнага пакупніка, дабіцца таго, каб ён набыў кнігу, — гэта свайго роду майстэрства. Гэтым майстэрствам добра валодае прадаўшчыца Л. Сарнова.

Аддзел па продажу літаратуры краін народнай дэмакратыі быў створаны ў лютым 1956 года. Кіраўнікі не толькі абласнога, але і рэспубліканскага кніжнага гандлю доўга не хацелі адкрываць гэты аддзел, баючыся, што не будзе пакупнікоў.

Л. Сарнова навучалася ў інстытуце замежных моў, добра валодае англійскай, нямецкай і польскай мовамі.

Аддзел яна прыняла, але кніг для гандлю яшчэ не было. Іх патрэбна было выпісваць праз Маскву. Перш чым паслаць заказ за мяжу, неабходна ўлічыць попыт пакупнікоў.

Спачатку Л. Сарнова пачала заказваць невялікую колькасць кніг, асабліва дзіцячых. Трэба сказаць, што выдавецтвы Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Польшчы і Чэхаславакіі добра выдаюць кнігі. Таму замежная дзіцячая літаратура адразу прыцягнула ўвагу мінскіх пакупнікоў. Каля гэтага прылаўка з кожным днём павялічвалася колькасць пакупнікоў, якія жадалі набыць творы класікаў польскай, нямецкай, балгарскай, кітайскай, чэшскай, румынскай, албанскай літаратуры. Гэта навуковыя работнікі Акадэміі навук БССР, Дзяржаўнага універсітэта, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў, студэнты, аспіранты, настаўнікі, урачы і многія іншыя. Яны купляюць патрэбныя ім кнігі, даюць свае заяўкі. Сталі паступаць заказы ад жыхароў Брэста, Гродна, Маладзечна, Полацка, Пінска і іншых гарадоў і раёнаў рэспублікі. На кожнае пісьмо Л. Сарнова дае своечасовы адказ, імкнецца задаволіць просьбу свайго карэспандэнта. Цяпер пакупнікоў у аддзеле не менш, чым у аддзеле мастацкай літаратуры.

Толькі на біблятэчку польскіх класікаў падпісаліся ўжо 93 чалавекі.

К. ПЫРХ.

На здымку: Л. Сарнова паказвае пакупнікам навінкі зарубежнай літаратуры.

Фото **Ул. Крука.**

У дружбе з песняй

За пяць кілометраў ад Рэчыцы, на беразе поўнаводнага Дняпра, раскінулася са сваімі прасторнымі і прыгожымі вуліцамі вёска Азяршчына — цэнтр калгаса імя Леніна. Гэта радзіма добра вядомага Азяршчынскага беларускага народнага хору, які заснавала заслужаны дзеяч мастацтва БССР Тацяна Карнееўна Лапаціна.

У мінулым годзе хору споўнілася 20 год. Калектыў напоўніўся здольнай моладдзю, якая ўнесла ў хор задор і энтузіязм. Заслухаешся спевам маладых салістак Тацяны Серак, Клары Броўкі, Валянціны Петравец, Елены Лазаровіч і іншых. Хор мае здольнага мастацкага кіраўніка, завочніка Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Мікалая Сокалава.

Творчая група хору паказвае выдатныя ўзоры апрацоўкі старадаўніх беларускіх народных песень і на іх аснове стварае новыя сучасныя песні, якія адлюстроўваюць нашу совецкую рэчаіснасць. Так, тэксты і музыка песень «Шчабятуха», «Ой, хварае мая жонка» і іншых створаны самім калектывам. Хор творча расце і ўдасканальвае свае майстэрства.

У мінулым годзе хорам праведзена вялікая работа па абслугоўванню працаўнікоў сельскай гаспадаркі раёна. Быў дадзены рад канцэртаў у калгасах «Перамога», імя Леніна, імя Молатава, імя Калініна. Тры разы хор выступаў у Гомелі і выязджаў у іншыя раёны вобласці.

Побач з канцэртамі, з якімі хор выступае перад сваімі аднавяскоўцамі, ён рыхтуе вялікую фестывальную праграму. Яна грунтуецца на мясцовым матэрыяле, уключае вакальна-харэаграфічную кампазицыю «Ведрыца» па народнаму паданню, запісанаму беларускім паэтам М. Лужаніным. З ім хор трымае цесную сувязь. Максім Лужанін спецыяльна для хору перапрацаваў гэты матэрыял, склаў кампазицыю, напісаў сцэнарый.

Творчую сувязь хор трымае з паэтамі і з кампазітарамі Беларусі. На словы Адама Русака створаны песні «Дняпро», «Заплела я косы русыя» і іншыя. У канцы мінулага года ў Гомелі на вечары, прысвечаным беларускай народнай песні, адбылася творчая сустрэча хору з паэтам.

Вялікую дапамогу хору аказвае народны артыст БССР Г. Цітовіч. У мінулым годзе ён два разы наведаў Азяршчыну, адрэдагаваў зборнік «Песні і частушкі Азяршчынскага беларускага народнага хору».

Для плённай работы хору і гурткоў мастацкай самадзейнасці створаны ўсе ўмовы: зроблены рамонт памяшкання Дома культуры, набыты патрэбны інвентар. У гэтую работу многа працы ўклалі члены хору — рабочыя суднавярфі комсамольцы Іван Лапата, Валерый Серак і Анатоль Сумак. Асабліваю павагай у калектыве карыстаюцца даўнія яго члены В. Петравец і Б. Серак.

Творчая дзейнасць Азяршчынскага беларускага народнага хору на працягу ўсіх 20 год непарыўна звязана з народам, Радзімай, роднай Комуністычнай партыяй. Заўсёды, калі хто запытаецца ў членаў хору, што галоўнае ў іх дзейнасці, яны з гонарам адказваюць:

— Сваімі песнямі мы славім шчаслівае калгаснае жыццё, нашу родную партыю, любімую Совецкую Радзіму.

Л. ГОЛЫШ,

М. НЕВАДНІЧЭНКА.

МОЛАДЗІ—ЛЕТАПІС ГЕРАЇЧНЫХ ДЗЁН

У дні незабыўных кастрычніцкіх падзей былі падлеткамі тыя, хто ў пачатку 20-х гадоў песняй заявіў аб сабе:

Мы — маладая гвардыя
Рабочых і сялян.

Гэтую песню часам перадаюць па радыё, і яна ўспрымаецца цяпер многімі як голас далёкай маладосці. Былыя комсамольцы, якія помняць прамоўцаў з чырвонымі бантамі на грудзях, атрады чырвонагвардзейцаў, гістарычныя падзеі 1917 года і грамадзянскай вайны, цяпер ужо маюць паважны ўзрост. Ідзе саракавы год Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі, і гэты факт гаворыць і аб узросце тых, хто рыхтаваў яе і са зброяй у руках змагаўся за ўладу Совецкаў.

Маладая гвардыя 20-х гадоў, працуючы разам са старымі большэвікамі, удзельнікамі рэволюцыі, непасрэдна выхоўвалася на іх вопыце. Яна сталела. Гэтае пакаленне людзей, якое фарміравалася ва ўмовах совецкай улады, са славай несла «галоўную службу» ў нашай дзяржаве перад Айчыннай вайной, у суровыя гады вайны і нясе яе цяпер.

Гады перадваенных пяцігодак, Айчыннай вайны з'яўляюцца таксама старонкамі біяграфіі нашай моладзі, але падзеі Вялікага Кастрычніка і папярэдніх рэволюцый здаюцца ёй не блізкай гісторыяй. Ужо рэдка сустракаюцца людзі — удзельнікі і сведкі першай рускай рэволюцыі, якія маглі-б расказаць аб умовах сваёй падпольнай работы, аб забастоўках, дэманстрацыях, аб усёй складанасці класавага змагання, у якім гартавалася ленінская партыя, згуртоўвала працоўных вакол сябе і прывяла іх да перамогі 1917 года. З такіх успамінаў заўсёды паўстае гераічны вобраз большэвіка-ленінца, важака мас — бясстрашнага і непрымірымага да ворагаў, сціплага і бескарыслівага, усё жыццё якога было падпарадкавана справе вызвалення народа. Волю гэтага большэвіка не маглі зламаць ні царская турма, ні катаргі, ні ссылка.

Наша слаўная моладзь будзе новыя гарады, заводы, электрастанцыі, асвойвае цаліну і аблогі. Яна мае яркія ўзоры для сваіх паводзін — працоўныя подзвігі комсамольцаў Дняпрабуда і Магніткі, подзвігі герояў Айчыннай вайны. Аб гэтым ёй расказвалі бацькі — удзельнікі даўніх баёў за Радзіму, аб гэтым яна чытала ў кнігах. Такімі-ж яркімі, свежымі ў памяці маладых совецкіх людзей павінны быць і подзвігі, справы старых большэвікоў, іх жыццё і змаганне.

У свой час Маякоўскі раіў юнаку, які абдумваў «сделать бы жизнь с кого», узяць за ўзор палымянае жыццё Фелікса Дзержынскага. Вялікім прыкладам, духоўным узбагачэннем для совецкіх людзей з'яўляецца жыццё і дзейнасць выдатных дзеячоў Комуністычнай партыі. Серыя іх біяграфій прынесла-б вялікую карысць справе выхавання моладзі. Неабходна мець на ўвазе і ўспаміны старых комуністаў—удзельнікаў кастрычніцкіх падзей, якія друкаваліся ў перыядычных выданнях і выходзілі асобнымі кнігамі ў 20-х гадах. Надзённыя і неабходныя сёння, яны павінны быць папоўнены новымі ўспамінамі ветэранаў рэволюцыі.

Паваротны этап у развіцці чалавецтва — Вялікі Кастрычнік. Ён заўсёды будзе хваляваць і прыцягваць да сябе ўвагу працоўных усяго свету. Асвятленне падзей рэволюцыі на ўсёй тэрыторыі нашай краіны з'яўляецца неадкладнай задачай совецкіх гісторыкаў. Па нашай гістарычнай, мемуарнай і мастацкай літаратуры мы можам уявіць, як заваёўвалася ўлада Совецаў у Петраградзе, Маскве і іншых буйных цэнтрах краіны. Але падзеі, што адбываліся ў 1917 годзе на яе ўскраінах, яшчэ недастаткова вывучаны і адлюстраваны. Гэта было адзначана з трыбуны XX з'езду КПСС і ў поўнай меры датычыцца беларускіх гісторыкаў і пісьменнікаў.

Да гэтага часу мы не маем грунтоўнай навуковай працы, якая падрабязна асвятляла-б поступ Кастрычніка на Беларусі з падачай фактаў, імён, падзей. Магчыма, адсутнасцю такой працы абумоўлена тое, што ў беларускай літаратуры пакуль што няма твора, дзе шырока паказвалася-б змаганне народа за Совецкую ўладу і яе станаўленне. Між тым тэрыторыя Беларусі была важнай арэнай барацьбы за социялістычную рэволюцыю. Па ёй праходзіў фронт першай сусветнай вайны. У Мінску размяшчаўся штаб Заходняга фронта, а ў Магілёве — Стаўка вярхоўнага галоўнакамандуючага, вакол якіх канцэнтраваліся контррэволюцыйныя элементы з усёй Расіі. У гэтых складаных умовах большэвіцкімі арганізацыямі Беларусі была праведзена вялікая работа па заваяванню працоўных мас на свой бок. Яна ўплывала на ўвесь ход падзей у краіне. Вядома роля большэвікоў Мінска, Оршы, Гомеля, Віцебска ў час карнілаўскага мяцежу і асабліва ў кастрычніцкія дні, калі контррэволюцыйная стаўка і штаб Заходняга фронта накіроўвалі верныя ім войскі на падаўленне рэволюцыі ў Пецербургу і Маскве. Па дарозе з фронта эшалоны гэтых войск затрымліваліся і абязбройваліся на вузлавых чыгуначных станцыях Беларусі.

Аб тым, наколькі падрабязна не вывучаны ў нас матэрыялы кастрычніцкіх дзён, сведчыць факт расказаны супрацоўнікамі музея Вялікай Айчыннай вайны. У 1952 годзе была знойдзена і перададзена музею пячатка райкома РСДРП(б), які быў створаны на Мінскім чыгуначным вузле ў 1917 годзе пры ўдзеле А. Ф. Мяснікова. У навуковых установах рэспублікі супрацоўнікам музея не ўдалося даведацца аб дзейнасці гэтага райкома. Ім прыйшлося шукаць старых большэвікоў-падпольшчыкаў. Высветлілася, што недалёка ад вакзала жыве былы член райкома РСДРП(б) К. Клачан, які напісаў падрабязныя ўспаміны аб 1917 годзе і дзейнасці райкома, пячатка якога захоўваецца цяпер у музеі. Шмат каштоўных матэрыялаў перадаў музею стары большэвік І. Голубеў. У кастрычніцкія дні ён камандаваў узброеным атрадам чыгуначнікаў з 400 чалавек, арганізаваным па рашэнню райкома. Атрад кантраляваў вайсковыя эшалоны і адыграў вялікую ролю ў станаўленні Совецкай улады ў Мінску.

Вядома, што ў 1917 годзе ў Беларусі працавалі выдатныя дзеячы Комуністычнай партыі: у Мінску — М. В. Фрунзе і А. Ф. Мяснікоў, у Гомелі — Л. М. Кагановіч, у Оршы — П. Н. Лепяшынскі. Аднак аб іх дзейнасці як належыць яшчэ не расказалі нашы гісторыкі і літаратары.

На саракавым годзе Вялікага Кастрычніка для нашай моладзі была-б дарагім падарункам кніга ўспамінаў аб незабыўным часе 1917 года. Такую кнігу павінны дапамагчы стварыць ветэранам рэволюцыі, удзельнікам кастрычніцкіх падзей пісьменнікі і журналісты. У ёй значнае месца неабходна адвесці мемуарам, што публікаваліся ў рэспубліканскім перыядычным друку ў 20-х гадах. У той-жа час наша грамадскасць чакае ад беларускіх вучоных грунтоўнай працы па гісторыі станаўлення Совецкай улады на Беларусі.

Аляксей РУСЕЦКІ.

Фільм аб першай рускай рэволюцыі

Нашы кінематаграфісты не раз звярталіся да падзей 1905 года.

Сёлета, калі ўсё прагрэсіўнае чалавецтва рыхтуецца адзначыць саракагоддзе Совецкай улады, работнікі кіно зноў аднавілі на экране незабыўныя дні першай рускай рэволюцыі 1905—1907 гадоў. На кіностудыі «Мосфільм» створаны новы каляровы шырокаэкранны мастацкі фільм «Пралог», які дэманструецца ў кінотэатрах краіны.

Новы твор совецкага кінамастацтва вылучаецца вялікім ахопам падзей. Тут і расстрал дэманстрантаў ля Зімняга, і стачка пуцілаўцаў, і Усерасійская забастоўка, і паўстанне на крэйсеры «Очакаў», і баі на Прэсні, і як апафеоз—штурм цытадэлі самаўладства—Зімняга Палаца ў кастрычніку 1917 года. На фоне гэтых падзей выступае галоўны герой фільма—народ.

Фільм «Пралог»—гэта перш за ўсё фільм аб рэволюцыйным народзе.

Пастаноўшчык фільма «Пралог» рэжысёр Е. Дзіган, аўтар шырока вядомай карціны «Мы з Кранштадта», імкнуўся паказаць не толькі рух народных мас, але і расказаць аб фарміраванні рэволюцыйнай самасвядомасці пролетарыята. На вобразах падпольшчыкаў - рэволюцыянераў ён раскрыў той складаны і цяжкі шлях, які прайшлі працоўныя да рэволюцыі. Прыкладам можа служыць вобраз піцерскага рабочага—каваля пуцілаўскага завода Круглова (артыст В. Салаўёў), які пад уплывам падзей становіцца свядомым барацьбітом рэволюцыі.

Вобраз Круглова праходзіць праз увесь фільм, і глядач бачыць, як паступова ідэі рэволюцыі авалодваюць яго свядомасцю. У пачатку ён пакорліва ідзе за Гапонам, затым, пасля «крывавай нядзелі» і смерці малодшай дачкі, парывае з гапонаўшчынай. У гэты час наспявае першы яго свядомы пратэст. Адміністрацыя завода рашыла выдаць пацярпеўшым «дапамогу». Круглоў кідае грошы ў твар сваім прыгнятальнікам. У той-жа час стары каваль яшчэ не верыць сваёй дачцы—рэволюцыянерцы Марфе. І толькі пасля размовы з Леніным ён усведамляе, што яго шлях з тымі, якія, не баючыся ні пакаранняў, ні турмаў, змагаюцца за народную справу.

Ёсць у фільме і іншыя не менш цікавыя вобразы. Да іх адносіцца Марфа Круглова (артыстка І. Кандрацьева), простая работніца, якая зразумела праўду раней за свайго бацьку. Марфа разам з дэманстрантамі адпраўляецца да Зімняга Палаца. Але яна не верыць у літасць цара. Яна прышла сюды, каб сказаць забітым цёмным людзям слова праўды. І яна дабілася свайго. Яе словы глыбока запалі ў душу лейб-гвардзейца Сямёнаўскага палка Філімонава (артыст П. Вінікаў), простага сялянскага хлапца, апранутага ў салдацкі шынель. У пачатку фільма ён не разумее таго, што адбываецца. Яго прымусяць страляць па дэманстрантах, і ён будзе страляць. Але вось здрыгнулася яго стрэльба. Словы горкай рабочай праўды трапілі ў цэль і нарадзілі новыя думкі.

Калі вобразы каваля Круглова, яго дачкі Марфы, салдата Філімонава поўнакроўныя, ярка і выразна выпісаны драматургам, без націскаў і зрываў сыграны таленавітымі акцёрамі, дык гэтага нельга сказаць пра вобразы іншых падпольшчыкаў-рэволюцыянераў. Ролі члена Пецербурскага камітэта партыі Фёдара і яго нявесты курсісткі Каці ў фільме выконваюць бясспрэчна таленавітыя акцёры В. Аўдзюшка і Д. Сталярская. Мы сустракаемся з імі на працягу ўсяго фільма, але нічога новага пра іх жыццё і барацьбу не даведваемся. Драматург А. Штайн не надзяліў гэтыя вобразы індывідуальнымі рысамі, і таму акцёрам, уласна, не было чаго іграць. Яны часта з'яўляюцца на экране, гавораць агульныя фразы і нічога новага не ўносяць у драматургічную тканіну фільма. Калі-б пастаноўшчык ліквідаваў у сцэнарыі ўсе сцэны, у якіх заняты В. Аўдзюшка і Д. Сталярская, дык фільм атрымаўся-б больш стройным і дынамічным. Прыходзіцца пашкадаваць, што А. Штайн механічна перанёс у сцэнарый гэтыя вобразы з п'есы, дзе яны былі проста неабходнымі.

У фільме «Пралог» выведзены вобраз арганізатара і кіраўніка Комуністычнай партыі, настаўніка і правадыра сусветнага пролетарыята Владзіміра Ільіча Леніна. Аўтары імкнуліся паказаць Леніна ў яго сусветна-гістарычнай ролі і адначасова стварыць вобраз глыбока чалавечны, родны і блізкі народу. Выканаўца гэтай складанай ролі М. Плотнікаў у сапраўднай рэалістычнай манеры праводзіць рад сцэн.

«Пралог»—фільм аб народзе. Тут многа батальных сцэн і буйных масовак. І гэта апраўдвае выбар аўтарамі шыроказкраннага адлюстравання. Але, на жаль, аператары В. Паўлаў і Б. Петроў нясмела карыстаюцца новым вынаходніцтвам. На працягу ўсёй карціны адчуваецца баязлівасць унутрыкадравага мантажа, г. зн. панарам, наездаў, аддаляў і г. д. У фільме пераважае статычнасць, хоць нярэдка пошукі новых кампазіцый прыводзяць аператараў да захапляючых кадраў. Так, напрыклад, карціны расстрэлу ля Зімняга, барыкадных баёў на Прэсні, штурму Зімняга Палаца ў кастрычніку 1917 года зняты імі с сапраўднай скульптурнай выразнасцю.

Я. КРУПЕНЯ.

На здымку: кадр з фільма. У ролі В. І. Леніна — артыст **М. Плотнікаў.**

«Пралог» — новы каляровы мастацкі гісторыка-рэволюцыйны фільм. Сцэнарый А. Штэйна. Пастаноўка Е. Дзігана. Аператары В. Паўлаў і Б. Петроў. Мастакі П. Кісялёў і Е. Серганаў. Кампазітар Н. Крукаў. Вытворчасць ордэна Леніна кіностудыі «Мосфільм», 1956 год.

Да знамянальнай даты

Некалькі месяцаў назад наведвальнікі Слуцкага краязнаўчага музея звярнулі ўвагу на карціну маладога аўтара, на якой быў адлюстраваны момант вызвалення горада Слуцка Совецкай Арміяй ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аўтарам гэтай карціны быў выкладчык адной са школ горада Павел Уласевіч.

Наведвальнікі музея крытычна аднеслісяда твора пачынаючага мастака. Яны зрабілі аўтару заўвагі, адзначылі недахопы яго карціны.

Уласевіч улічыў усе заўвагі і працуе цяпер над другім варыянтам гэтай карціны. Адначасова ён пачаў працаваць над палатном, дзе будзе паказана адна з рэволюцыйных падзей на Случчыне. «Сутыкненне сялян вёскі Заграддзе з царскімі стражнікамі ў 1908 годзе» — так будзе называцца яго новая карціна.

Сваю новую працу Уласевіч мяркуе закончыць да 40-годдзя Вялікага Кастрычніка.

У горадзе Слуцку працуе яшчэ адзін самадзейны мастак — В. Садзін. Ён кіруе гуртком выяўленчага мастацтва пры Доме піонераў. Садзін — аўтар раду эскізаў, пейзажных замалёвак, партрэтаў. У 1954 годзе на гарадской выстаўцы пачынаючых мастакоў яго работы атрымалі выдатную ацэнку і былі цёпла сустрэты наведвальнікамі выстаўкі.

Цяпер В. Садзін працуе над карцінай «Ленін сярод дзяцей», якую таксама мяркуе закончыць да 40-годдзя Вялікага Кастрычніка.

М. ТЫЧЫНА.

Перадачы беларускага радыё да 40-годдзя Кастрычніка

Работнікі беларускага радыё распрацавалі вялікі план перадач, прысвечаных 40-годдзю Вялікага Кастрычніка. У ім прадугледжаны артыкулы і гутаркі аб Комуністычнай партыі — кіруючай і накіроўваючай сіле совецкага грамадства, аб саюзе рабочага класа і сялянства, аб росквіце социялістычных нацый.

Пад назвай «Краіна Советаў за 40 год» арганізуюцца перадачы з братніх саюзных рэспублік. У перадачах «Новае на карце Беларусі» будзе расказана аб росце і стане народнай адукацыі, аховы здароўя, культуры, жыллёва-бытавога будаўніцтва ў рэспубліцы.

Па радыё выступяць прадстаўнікі старэйшага пакалення з апавяданнямі аб жыцці дарэволюцыйнай Беларусі.

Раздзел «Беларусь індустрыяльная» будзе прадстаўлены перадачамі аб развіцці прамысловасці рэспублікі за 40 год. Лепшым людзям прадпрыемстваў, майстрам высокай прадукцыйнасці працы прысвячаюцца радыёнарысы пад агульнай назвай «Залаты фонд»

У цыкле «Людзі новых прафесій у вёсцы» будуць перадавацца нарысы, гуткі аб работніках такіх прафесій, якіх не было ў дарэволюцыйнай вёсцы. Плануецца рад перадач для працаўнікоў сельскай гаспадаркі. Вялікае месца ў плане займуць перадачы аб развіцці беларускай літаратуры і мастацтва.

Канферэнцыі і літаратурныя вечары

Звыш 2.400 рабочых і інжынераў гомсельмашаўцаў з'яўляюцца чытачамі заводскай бібліятэкі. На паліцах кнігасховішча каля 18 тысяч кніг па ўсіх галінах ведаў. Кніжны фонд увесь час расце. Бібліятэка атрымлівае падпісныя выданні, многа часопісаў, звыш 20 назваў газет.

Многа чытаюць і часта наведваюць бібліятэку бляшаншчык Уладзімір Грушын, электрык Мікалай Лызь, слесар Уладзімір Лыгін, токар Аркадзь Рабіновіч, супрацоўніца аддзела забеспячэння Ася Сітнікава, інжынер Георгій Кацубанаў і іншыя.

У мінулым годзе на «Гомсельмашы» праведзена 26 літаратурных вечароў, канферэнцый чытачоў і лекцый на літаратурныя тэмы. Актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні літаратурных вечароў і канферэнцый прымаюць супрацоўніца бібліятэкі Мілянціна Слуцкая, загадчык парткабінета Іван Жыхараў, супрацоўнік заводскай шматтыражкі паэт Браніслаў Спрынчан, токар Анатоль Кандраценка, супрацоўніца заводскага камітэта комсамола Вольга Брэсцкая і многія іншыя машынабудаўнікі. Заводская бібліятэка рыхтуе цяпер канферэнцыю чытачоў па кнізе В. Кочэтава «Маладосць з намі». У цэхах завода праводзяцца калектыўныя чыткі гэтага рамана.

В. СЯМЕНАЎ.

Радасная падзея ў музычным жыцці

Абмеркаванне оперы „Надзежда Дурава" ў Беларускім тэатральным таварыстве

Гэтымі днямі ў Беларускім тэатральным таварыстве абмяркоўвалася опера «Надзежда Дурава» А. Багатырова. У абмеркаванні прынялі ўдзел артысты тэатраў, рэжысёры, кампазітары, мастакі. З дакладам выступіў народны артыст БССР **С. Бірыла.**

На сцэне тэатра, сказаў ён, з'явілася сапраўды таленавітая і арыгінальная работа. Прыемна было слухаць яе ў выкананні маладых артыстаў (няхай не зусім яшчэ дасканалым). Мімаволі думаеш, што час шырэй выкарыстоўваць маладыя тэатральныя кадры.

Выканаўцы — і К. Кудрашова, і Л. Галушкіна, і М. Зюванаў, і Г. Дзмітрыеў, і хор, і аркестр — спяваюць і іграюць з той непасрэднасцю і захапленнем, якое можа быць толькі ў маладосці.

Дырыжор спектакля народны артыст БССР Л. Любімаў глыбока раскрыў якасці музыкі оперы, старанна развучыў з выканаўцамі складаную партытуру і знайшоў правільнае, праўдзівае музычнае ўвасабленне спектакля.

Дакладчык не згодзен з трактоўкай ролі Дзеніса Давыдава М. Ворвулевым. Давыдаў — паэт, весялун і разам з тым мужны воін. Але М. Ворвулеў паказвае нам толькі веселуна, чалавека, які часам несур'ёзна ставіцца да падзей.

В. Сізко зрабіла падрабязны музычны аналіз спектакля. На яе думку, рухаючай сілай у гэтым спектаклі з'яўляецца хор. Ён—аснова драматургічнай пабудовы оперы.

У свой час, асабліва ў оперным мастацтве, мела месца празмерная плакатнасць у паказе падзей і герояў. А. Багатыроў гэтага пазбегнуў. Так, напрыклад, амаль усё, што датычыць вобраза Надзежды-жанчыны, у музычным плане зроблена сапраўды цікава і арыгінальна. Тое-ж самае можна сказаць пра вобразы Дзеніса Давыдава, бацькі Надзежды Дуравай, Палонскага і г. д.

Разам з тым В. Сізко лічыць, што такія музычныя моманты, як зварот Давыдава да карнета ў песні «Кажуць салдаты, баба ў нашым войску завялася», вельмі зніжае ролю Надзежды-воіна. Сама па сабе песня, як жанравы прыём, вельмі добрая, але яна з'яўляецца катэгарычным пратэстам супраць асноўнай ідэі — паказаць адзіную жанчыну — героя Айчыннай вайны 1812 года.

З некаторымі палажэннямі дакладчыка і асабліва В. Сізко палемізавалі прафесар **І. Палфёраў, Л. Любімаў, Л. Александроўская.**

Прафесар І. Палфёраў сказаў, што праблема опернага жанра па-ранейшаму застаецца вельмі вострай. З таго часу, як ЦК КПСС прыняў гістарычную пастанову аб оперы «Вялікая дружба» В. Мурадэлі, совецкія кампазітары напісалі рад твораў, якія сведчаць аб далейшым развіцці совецкага опернага мастацтва ў духу рэалістычных традыцый рускай музыкі.

Опера «Надзежда Дурава» безумоўна з'яўляецца вялікай падзеяй у музычным жыцці не толькі рэспублікі, але ўсёй нашай Радзімы. Опера А. Багатырова — прыклад удумлівага выкарыстання класічнай спадчыны: тут самабытная мова кампазітара, тонкія малюнкі псіхалагічных перажыванняў герояў, удала выкарыстаны розныя элементы опернага твора — арыі, рэчытатыў, хары.

Разам з тым І. Палфёраў адзначае, што ў оперы ёсць істотныя недахопы. Адзін з іх — дэманстрацыя нерухомай панарамы ў час сімфанічнай карціны, якая паказвае момант Барадзінскай бітвы. І калі музыка адлюстроўвае імклівы рух рускіх войск, вялікія і моцныя перажыванні, глядач бачыць нерухомы сілуэт Кутузава. Гэта—рэзкія кантрасты паміж зрокавым і слыхавым успрыняццямі. Рэжысёр спектакля мог-бы пазбегнуць гэтага, калі-б ён выкарыстаў хаця-б просты прыём, як воблакі, якія хутка рухаюцца. Ёсць рад іншых недаробак. Не усе, напрыклад, салісты дакладна вымаўляюць тэкст і не ўсе ансамблі даведзены да канца. І. Палфёраў не згодзен з заўвагай С. Бірылы адносна вобраза Дзеніса Давыдава ў выкананні М. Ворвулева. Палфёраў бачыць у Давыдаве мужнага і адважнага афіцэра, які можа лёгка аддаць жыццё за Радзіму.

Прамоўца слушна зазначыў, што тэатр оперы і балету (ды і іншыя тэатры рэспублікі) не прапагандуе свае спектаклі сярод гледачоў. У вестыбюлях тэатра няма здымкаў з пастановак. Наведвальнікі ахвотна набылі-б брашуру, якая расказала-б ім аб тым ці іншым спектаклі.

Кампазітар **Я. Цікоцкі** пагадзіўся са станоўчай ацэнкай спектакля, з крытычнымі заўвагамі І. Палфёрава. На яго думку, у асобных месцах опера патрабуе большай яскравасці. Асабліва гэта пажадана ў сцэне развітання з Палонскім.

Р. Млодэк гаварыла аб тым, што работнікі Упраўлення па справах мастацтва яшчэ не аказваюць дастатковай творчай дапамогі тэатру ў ажыццяўленні пастановак. Мала цікавяцца яны і творчымі поспехамі артыстаў. Аб гэтым сведчыць той факт, што на абмеркаванне новай беларускай оперы ніхто з іх не з'явіўся.

Слушную заўвагу ў адрас кампазітараў зрабіў дырыжор Л. Любімаў. Ён сказаў, што кампазітары рэспублікі рэдка сустракаюцца з работнікамі тэатра, не наладзілі яшчэ шчыльнай творчай сувязі з імі. Пасля пастаноўкі оперы «Надзежда Дурава» партфель тэатра застаўся пустым.

З аналізам оперы выступіла рэжысёр-пастаноўшчык **Л. Александроўская.** Яна, як і многія іншыя, мяркуе, што гэта опера з'яўляецца народнай музычнай драмай. Нягледзячы на тое, што спектакль добра прыняты мінскім гледачом і атрымаў станоўчую ацэнку, творчая работа над ім працягваецца. Л. Александроўская сказала, што яе, як рэжысёра, яшчэ не задавальняе сцэнічнае ўвасабленне атмасферы бою ў пятай карціне. Патрэбна ўзмацненне масавых сцэн, павелічэнне хору. Пры пастаноўцы спектакля была думка закончыць оперу хорам. Але ад гэтага прышлося адмовіцца — у тэатры ўсяго 23 мужчынскія галасы. Што датычыцца артыстаў мімансу, то іх усяго чатыры чалавекі.

Л. Александроўская згаджаецца з тым, што тэатр не працуе з гледачом. Яна робіць справядлівы папрок і газеце «Советская культура», якая да гэтага часу не адгукнулася хоць-бы кароткай заметкай аб творчай удачы беларускай оперы.

Кампазітар **А. Багатыроў** расказаў, як ён працаваў над операй. Ён адзначыў, што цяжка стварыць новае лібрэта, а затым і оперу, не паклаўшы ў аснову іх выдатнага буйнага літаратурнага твора. Але нельга пагадзіцца з думкай прамоўцы, быццам нашым кампазітарам не хапае добрых раманаў на сучасныя тэмы. У беларускай літаратуры ёсць такія творы, як «Сустрэнемся на барыкадах» П. Пестрака, «Векапомныя дні» М. Лынькова, «Глыбокая плынь» І. Шамякіна, «Сымон-музыка» Якуба Коласа і інш.

Слушна гаварыў А. Багатыроў і аб тым, што кампазітары і пісьменнікі рэспублікі працуюць адасоблена.

Абмеркаванне новай беларускай оперы «Надзежда Дурава» прайшло ў творчай, дзелавой абстаноўцы.

На здымку: К. Кудрашова ў ролі Надзежды Дуравай.

БЛІЖЭЙ ДА МУЗЫКІ!

Аматары музыкі з вялікім задавальненнем прачыталі ў газеце «Правда» (6 студзеня 1957 г.) артыкул Дм. Кабалеўскага «Важнае пытанне музычнай культуры».

Усё часцей на старонках нашага друку ўзнімаецца голас за шырокую прапаганду музычнай культуры. Сапраўды, нельга без трывогі ставіцца да таго, што сярод моладзі паслаблена цікавасць да сур'ёзнай класічнай і сучаснай музыкі.

Калі такія сумныя з'явы назіраюцца сярод моладзі ў гарадах, дзе ёсць опера, дзе ў канцэртных залах выступаюць дзяржаўныя хоры, сімфанічныя аркестры, прафесіянальныя музыканты і спевакі, дык што-ж казаць аб сельскіх мясцовасцях! У раённыя цэнтры раз ці два ў год загляне абласны ансамбль песні і танца, а ў нашых населеных пунктах і гэтага ніколі не пачуеш. І не дзіва, што не толькі моладзь, але і інтэлігенцыя часам не разумее сур'ёзную музыку і не ўмее слухаць. Не так даўно ў адным мястэчку ішоў фільм-спектакль «Барыс Гадуноў». І вось, пачынаючы з другога перапынку, паміж часткамі карціны некаторыя з гледачоў паціхеньку пачалі шмыгаць за дзверы. Першымі ўцяклі з залы настаўніцы. На другі дзень яны тлумачылі гэта тым, што не разумеюць опернага мастацтва і ім сумна было сядзець. Многія сельскія інтэлігенты цураюцца ўдзелу ў мастацкай самадзейнасці, хоць маюць да гэтага адпаведныя даныя.

Адзінай формай прапаганды музычнай культуры на вёсцы з'яўляецца радыё. Не так яшчэ даўно з ранку да вечара трансліравалі запетыя песенькі, накшталт «Ходит по полю девчонка», «Жди солдата», «У нас в общежитии свадьба» і інш. Бывала, адну і тую самую песню паўтараюць тры-чатыры разы ў дзень.

З задавальненнем трэба адзначыць, што за апошні час значна палепшыліся музычныя перадачы. З вялікай радасцю цяпер слухаеш такія цудоўныя перадачы, як «Эпоха Рэнесанса ў музыцы», «Мастацтва Эміля Гілельса», сюіта Грыга «Пер Гюнт» і інш. Такія перадачы часцей трэба трансліраваць і паўтараць. З жалем і зайздрасцю даведаліся з газет аматары музыкі, што ў Мінску выконваўся выдатны твор Моцарта «Рэквіем». Чаму-ж пазбавілі гэтай прыемнасці перыферыйных радыёслухачоў?

Некалькі слоў аб развіцці музычнай культуры сярод дзяцей. Усім вядома, што ў нашых школах амаль поўнасцю занядбана справа эстэтычнага выхавання. Аб гэтым пісаў у свой час Р. Шырма, а цяпер піша ў сваім артыкуле Дм. Кабалеўскі. У гэтай справе радыёвяшчанне таксама можа зрабіць многа.

Вялікая патрэба адчуваецца ў выданнях папулярных лекцый аб творчасці кампазітараў-класікаў і совецкіх кампазітараў з далучэннем спісу пласцінак для музычнай ілюстрацыі іх твораў. Такія лекцыі з камплектам пласцінак павінны знаходзіцца ў кожным раённым і сельскім Доме культуры так, як і кнігі ў бібліятэках.

П. МЯДЗЕЛКА,
кіраўнік Будслаўскага сельскага хору.

Трэба быць песняром свайго народа

Совецкі мастак — гэта перш за ўсё творца, якога глыбока хвалюе жыццё народа, яго быт, культура, працоўныя поспехі. На гэтай аснове расквітнела совецкае выяўленчае мастацтва нашай рэспублікі.

Неўзабаве адбудзецца Усесаюзны з'езд совецкіх мастакоў. У сувязі з гэтым ужо цяпер шырока разгарнуліся гарачыя спрэчкі аб майстэрстве, выказваюцца розныя думкі і погляды на мастацтва. Зноў паўстаюць задачы паглыблення прафесіянальнага майстэрства нашых мастакоў, без чаго не можа рухацца мастацтва социялістычнага рэалізма. Сёння зноў многія прыгадваюць класікаў айчыннага мастацтва, якія надавалі выключна вялікае значэнне авалоданню лепшымі дасягненнямі сусветнага мастацтва. Пытанне майстэрства застаецца невычэрпным да той пары, пакуль будзе існаваць само мастацтва.

Аднак барацьба з перажыткамі культу асобы, факты адрыву мастакоў ад жыцця свайго народа, лакіроўкі і фальшу ў паказе рэчаіснасці ставяць на першае месца пытанне грамадзянскага абавязку мастака, яго сумлення і чысціні ў адлюстраванні вобразаў, тыпаў, характараў ва ўсёй іх глыбіні. Узнікае патрэба шырокага абмеркавання не толькі пытанняў фармальных сродкаў выяўлення, але перш за ўсё адносін мастака да праўды жыцця, бо высокае мастацтва — гэта перш за ўсё праўдзівае адлюстраванне рэчаіснасці.

Такое мастацтва заўсёды мела сваю нацыянальную форму. Ніяк нельга ўявіць запазычаную форму ў творах В. Перова, І. Раніна, В. Сурыкава, І. Шышкіна, І. Левітана. Галоўнай задачай класікаў выяўленчага мастацтва была барацьба за нацыянальную школу, за глыбокае пранікненне ў душу свайго народа.

«Мастацтва, — гаварыў І. Крамской,— можа быць толькі нацыянальным, абавязкова нацыянальным і ніякім іншым быць не можа», — разумеючы пры гэтым самую прыроду мастацтва вельмі шырока.

Нельга забывацца і на спецыфічныя асаблівасці совецкага мастацтва, на яго гістарычную ролю ў выхаванні мільёнаў простых людзей, яго значэнне ў справе ўмацавання дружалюбных адносін паміж братнімі народамі Совецкага Саюза і за яго межамі.

Узбагачэнне выяўленчых сродкаў мастака залежыць поўнасцю ад глыбіні ўсведамлення ім свайго грамадзянскага абавязку. Для мастака вельмі важна не разгубіць і захаваць у сваім сэрцы першыя ўражанні свайго юнацтва, тыя моцныя захапленні, якія праходзяць праз усё яго свядомае жыццё, як нешта незабыўнае, дарагое і натхняючае. Да гэтай чыстай крыніцы ўражанняў мастак звяртаецца ў хвіліны свайго глыбокага роздуму аб Радзіме, аб сваім народзе. Уражанні дзяцінства Гогаля, Шэўчанкі, Горкага, Рэпіна, Сурыкава, Янкі Купалы, Якуба Коласа адбіліся на ўсім іх далейшым жыццёвым і творчым шляху.

З якой шчырасцю, павагай і душэўнай узнятасцю ставіўся Сурыкаў да свайго Краснаярскага краю! Для вялікага мастака не існавала больш моцнага і душэўна багатага народа за краснаярскіх казакаў. Дружына Ермака, якая перамагае полчышчы татар у карціне «Пакарэнне Сібіры Ермаком», гордыя стральцы, якія мужна ідуць на шыбеніцу ў карціне «Раніца стралецкага пакарання», народ у карціне «Узяцце снежнага гарадка», салдаты легендарнага Суворава ў карціне «Пераход Суворава праз Альпы», героі карціны «Сцепан Разін» — усё гэта сібіракі, краснаярцы, людзі, якія мастак палюбіў на ўсё жыццё. Які-б твор ні пісаў мастак, ён звяртаўся да роднага краю, чэрпаў адтуль свае настроі і думкі, знаходзіў сваіх герояў, незалежна ад таго, дзе ім даводзілася дзейнічаць, на Краснай плошчы ў Маскве, ці ў зімніх сцюжах няветлівых Альпійскіх гор. Адсюль вынікае і самабытнасць творчай індывідуальнасці, і тэмы, і фарбы, сугучныя суровай прыродзе і характару народа Сібіры. У яркай творчасці сапраўды вялікага мастака цяжка знайсці якія-небудзь уплывы. Ён заўсёды ўзвышаецца, як маяк, адкрываючы шлях іншым.

Павучальныя прыклады гісторыі айчыннага мастацтва мімаволі напрошваюцца, калі мы звяртаемся да фармалістычнага мастацтва. З пустою душою выступілі яго апалагеты ў першыя гады совецкай улады. Былі яны і ў беларускім мастацтве. За час іх дзейнасці ім так і не ўдалося стварыць значных твораў, адзначаных нацыянальнымі рысамі. Бурныя гады рэволюцыі на Беларусі, жыццё гарадоў і сёл, энтузіязм народа, пафас яго барацьбы за ператварэнне рэспублікі з адсталай аграрнай краіны ў краіну магутнай індустрыі і буйнай сельскай гаспадаркі засталіся па-за іх увагай. «Майстры» модных напрамкаў тых гадоў псавалі таленавітую моладзь, спусташаючы тое лепшае, што заставалася ў яе, набытае там, адкуль яна прыходзіла ў мастацтва. Гэтыя перажыткі выхавалі абыякавасць да ўсяго роднага і блізкага і з'явіліся прычынай стварэння тых жывапісных і скульптурных халодных твораў, за якімі гублялася душа мастака, само мастацтва.

Можа таму адзін час цяжка было назваць творы мастакоў, у якіх былі-б пасапраўднаму паказаны наша Палессе, Случчына, Полаччына, Гродзеншчына і іншыя куткі багатай натуры Беларусі. Яны не даюць поўнага ўяўлення аб нашай рэспубліцы, яе гісторыі, народзе, быце, асаблівасцях некаторых яе раёнаў, гарадоў, прыроды вёсак і мястэчак. Не толькі ў асобных абласцях, але ў калгасным раёне, нават у кожнай вёсцы ёсць нешта сваё, адметнае ў жыцці і быце людзей.

Між тым на рэспубліканскіх выстаўках часамі вельмі цяжка адрозніць творы беларускіх мастакоў адзін ад другога, быццам усе яны створаны па адной і той-жа натуры. Аднак ёсць нямала ўзораў беларускага жывапісу і скульптуры, дзе можна бачыць таленавітае раскрыццё нацыянальнага характару народа. У невялікім барэльефе А. Бембеля «Беларуска» скульптару ўдалося паказаць гасціннасць і дабрату беларускага народа.

Трывала ўвайшоў у лік лепшых твораў мастацтва рэспублікі партрэт выдатнага сына беларускага народа Героя Совецкага Саюза Гасталы.

Вельмі многа характэрнага знайшоў скульптар А. Глебаў у партрэтах Янкі Купалы, народнага артыста СССР Уд. Уладамірскага, Георгія Скарыны.

Героіка беларускага народа адлюстравана ў многіх творах З. Азгура, асабліва ў яго партрэтах Герояў Совецкага Саюза Міхаіла Сільніцкага, Хвядоса Смалячкова, Бацькі Міная, В. Казлова, дзеячоў беларускай культуры і інш. У партрэтным жанры вядомы спробы скульптара ўваскрасіць старонкі далёкага мінулага беларускага народа, што выявілася ў бюстах вядомых арганізатараў барацьбы рускага і беларускага народаў з нямецкімі захопнікамі-мечаносцамі ў пачатку XIII стагоддзя князёў Уладзіміра Полацкага і Васілька Мінскага, Стахора Мітковіча, які ўзначаліў у 1606 годзе паўстанне народных мас у Магілёве.

У жывапісе таксама зроблены некаторыя крокі ў адлюстраванні жыцця беларускага народа. Значныя поспехі ў гэтым напрамку былі паказаны ў час першай дэкады беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве. Сярод твораў, якія тады экспанаваліся, вылучаліся карціна Я. Зайцава «Вызваленне Мінска Чырвонай Арміяй у 1920 годзе», «Вызваленне Заходняй Беларусі» М. Манасзона, «Падпольная друкарня» К. Касмачова і некаторыя іншыя. Спіс гэтых значна папоўніўся творамі за перыяд Вялікай Айчыннай вайны і пасля яе. Сярод іх — вялікае палатно В. Волкава «Мінск 3 ліпеня 1944 года», А. Шыбнёва «Палонных вядуць», В. Сухаверхава «За родную Беларусь», Я. Зайцава «Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 годзе». Напісана вялікая колькасць пейзажаў па матывах беларускай прыроды.

Параўнальна з дасягненнямі дваццатых і трыццатых гадоў, не кажучы ўжо аб дарэволюцыйным мастацтве Беларусі, мастакамі праароблена вялікая праца. Аднак супакойвацца на дасягнутым яшчэ рана.

Асноўным відам мастацтва і надалей застаецца сюжэтная карціна, якая па сваёй даступнасці і ўздзеянню на гледача з'яўляецца найбольш важным сродкам. Выдатная карціна з глыбокім зместам і высокай культурай формы запамінаецца на ўсё жыццё. Яна пераходзіць з пакалення ў пакаленне, як цудоўны скарб народа. У скульптуры на першае месца ставяцца манументальныя кампазіцыі. Мастацкае бачанне жыцця свайго народа нельга разумець як нейкі набор знешніх нацыянальных адзнак, падмацаваных узорамі народнага арнаменту, лапцямі, лірай, жалейкай, колерам валасоў. Справа, разумеецца, не ў этнаграфічных асаблівасцях, а ў глыбокіх тыповых прыметах, якія закладзены ў характары і душы самой натуры.

Для кожнага матыву, тэмы, сюжэта, для кожнага вобраза існуюць свае фармальныя сродкі, навеяныя натурай. У адным выпадку гэта шырокае пісьмо, у другім — гама халодная або цёплая, лінія плаўная або ламаная. Усё гэта ў залежнасці ад вместу, характару і стану натуры.

І. Шышкін, як вядома, любіў дэталь, даводзіў мадэліроўку натуры да граничнай выпісанасці. Творы «Карабельны гай», «Раніца ў сасновым лесе», «У лесе Мардвінавай», дзе з вялікай увагай адлюстраваны кожная галінка і сучок, «Дождж у дубовым лесе» напісаны свабодна і шырока, быццам пісаў яго зусім іншы мастак.

Тое-ж бачым і ў І. Левітана. «Вясна — вялікая вада», «Каля віру», «Летні вечар», «Сакавік», «Вячэрні звон», «Залаты восень» напісаны з вялікім непераймальным майстэрствам, і ў той-жа час кожны пейзаж нібы пісаны зусім іншай рукой. У першым выпадку з вялікай увагай да дэталей, а ў апошнім творы — быццам з аднаго ўзмаху рукі генія.

Адкуль-жа бралася форма для кожнага твора? Руская вясна, руская залатая восень, паэзія роднай прыроды сярэдняй паласы Расіі навявалі Левітану чароўныя фарбы, адтуль вынікала меладычная і незабыўная музыка жывапісу выдатнага творцы. І ў тым, што мастак лепш і глыбей іншых адчуваў дыханне роднай зямлі, і было яго прызванне.

Лірычны пейзаж, настрой рамантыкі, смутак, жаль, ноты чалавечага гора і радасці, творы аб далёкім мінулым і сучасным, героіцы і журбе патрабуюць сваіх, толькі ім належачых сродкаў выяўлення. З любоўю мастака да народа прыходзяць тэмы, сюжэты, характары, майстэрства. Народ, які нарадзіў мастака, натхняе яго, дае вечную маладосць яго творам. Нельга быць мастаком наогул, можна быць толькі песняром свайго народа.

П. ГЕРАСІМОВІЧ.

ПІСЬМЫ Ў РЭДАКЦЫЮ

Супярэчнасці і недакладнасці

Чытаючы адзін з падраздзелаў кнігі І. Краўчанкі, Н. Раманоўскага і Т. Хадкевіча «Беларуская ССР» (Дзяржпалітвыдат, Масква, 1956 г.), прысвечаны Беларусі ў гады грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі, сустракаеш супярэчнасці і недакладнасці.

На старонцы 60 напісана, што польскі корпус Доўбар-Мусніцкага «заняў Рагачоўскі, Жлобінскі, Бабруйскі паветы Магілёўскай губерні». На самай справе Бабруйскі павет ніколі не быў у складзе Магілёўскай губерні! З часу стварэння губерняў у Беларусі з канца XVIII стагоддзя і да іх скасавання, г. з. да 1924 года, ён уваходзіў у склад Мінскай губерні.

А далей (старонка 61) указваецца, што ў пачатку студзеня 1919 года ад нямецкіх «акупантаў была вызвалена ўся Беларусь, і ўсюды ўстаноўлена ўлада Саветаў». Але тады савецкая ўлада ў Заходняй Беларусі была ўстаноўлена не ўсюды, таму што ў радзе месц на тэрыторыю рэспублікі прэтэндавала панская Польшча, якая замяніла нямецкіх акупантаў. Так, напрыклад, з-за раёна горада Гродна, які быў у той час у руках белапольскіх акупантаў, ішлі спрэчкі паміж польскімі, літоўскімі і беларускімі буржуазна-нацыяналістычнымі ўладамі, якія даходзілі нават да ваенных сутыкненняў.

«У сярэдзіне ліпеня 1920 года, — як паведамляецца на старонцы 65, — савецкія войскі Заходняга фронта пачалі шырокае наступленне супраць белапалякаў». Агульнавядома, што Мінск ад белапалякаў быў вызвалены 11 ліпеня, а агульнае наступленне савецкіх войск Заходняга фронта ў Беларусі пачалося 4 ліпеня 1920 года, г. зн. у пачатку ліпеня, а не ў сярэдзіне, як сцвярджаюць аўтары кнігі.

Тут-жа праз адзін абзац напісана, што 1 жніўня 1920 года адбылося абвяшчэнне незалежнасці Беларускай ССР. На самай справе паўторнае абвяшчэнне незалежнасці Беларускай ССР адбылося 31 ліпеня 1920 года ў памяшканні Мінскага гарадскога тэатра на ўрачыстым пасяджэнні Ваенрэўкома БССР і прадстаўнікоў розных партый, прафсаюзаў і фабзаўкомаў. У гэты-ж дзень у газетах апублікавана «Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Беларускай ССР» («Савецкая Беларусь» № 14 ад 31 ліпеня 1920 года і № 16 ад 3 жніўня 1920 года, а таксама загад камандуючага Заходнім фронтам № 1795 ад 12 жніўня 1920 года).

Там-жа ўказваецца, быццам 20 кастрычніка 1920 года былі заключаны папярэднія ўмовы мірнага дагавору паміж Савецкай Расіяй і Польшчай. Але, як відаць з тэксту самога дагавору аб перамір'і і папярэдніх умовах міру, ён быў падпісаны 12 кастрычніка 1920 года і ўступіў у сілу 18 кастрычніка 1920 года.

Аўтары кнігі сцвярджаюць, што пасля заключэння гэтага перамір'я белапалякі працягвалі ўзброеную барацьбу. На самай-жа справе барацьба адбывалася толькі да 18 кастрычніка 1920 года, г. зн. да моманту ўступлення дагавору ў сілу. Пасля гэтага ваенныя дзеянні на ўсім Заходнім фронце спыніліся. Праўда, дзе-ні-дзе былі невялікія сутычкі з перадавымі або разведвальнымі часцямі ворага, але яны мелі выпадковы характар і хутка ўладкоўваліся. Сапраўдныя-ж ваенныя дзеянні працягваліся пасля перамір'я толькі ў Палессі з бандамі Булак-Балаховіча. Ці падтрымлівала яго Польшча? Пытанне спрэчнае. Банды з дапамогай Савінкава падтрымлівалі іншыя заходнія дзяржавы. Ваенныя дзеянні таксама вяліся ў Слуцкім павеце, які быў ахоплены кулацкім паўстаннем. Такім чынам, пасля заключэння перамір'я ішла барацьба з бандытамі, а не з польскімі войскамі.

Пры апісанні гістарычных падзей патрабуецца не толькі правільнае асвятленне іх сутнасці і значэння, але і дакладнае ўказанне дат гэтых падзей. Але недакладнасці, падобныя вышэй апісаным, ёсць і ў артыкуле «Беларуская ССР», напісаным для 4-га тома «Вялікай Савецкай Энцыклапедыі» (2-е выданне), і ў радзе іншых работ.

Допушчаныя недакладнасці з'яўляюцца прычынай недаацэнкі гістарычных крыніц, архіўных матэрыялаў савецкага перыяду.

В. ІЛЬЧОВА,
начальнік Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР,

Н. КАМІНСКІ,
старшы навуковы супрацоўнік Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР.

Мастак А. Паслядовіч выканала ілюстрацыі да кнігі А. Кононава «Апавяданні пра Леніна». Кніга выпускаецца Дзяржаўным выдавецтвам Беларусі ў перакладзе на беларускую мову.

На здымках: ілюстрацыі да кнігі.

Аповесць пра паэта

«Усё маё юнацтва прайшло на чужой зямлі ў беззупыннай залежнасці і пад гнётам польскага панства», — успамінаў ужо ў гады савецкай улады вялікі Купала — паэт, жыццёвы і творчы шлях якога з'яўляецца ў вышэйшай ступені ўзорам сыноўняй любві і адданасці свайму народу, сваёй Радзіме.

Доўгія і бязрадасныя гады бадзяння сям'і паэта ў пошуках прытулку і кавалка хлеба і ўваскрашае пісьменніца Зінаіда Бандарына на старонках невялікай аповесці «Ой, рана на Івана».

Крок за крокам прасочвае пісьменніца лёс сям'і беззямельнага гарапашніка Дамініка Луцэвіча, чэснага, цягавітага хлебароба, які ўсё жыццё шукаў справядлівасці і ўсё жыццё скрозь натыкаўся на ашуканства, на балючую крыўду, на зняважлівую абразу. Сведкай і ахвярай гэтага ладу жыцця быў ад першых дзён, як запомніў сябе, і старэйшы сын Дамініка Ануфрыевіча і Бянігды Іванаўны — Янка. З фальварка ў фальварак, ад аднаго гаспадара да другога вандруе сям'я Луцэвічаў на Барысаўскаму і Мінскаму паветах, падзяляючы лёс усяго працоўнага сялянства. Правільна робіць пісьменніца, што акцэнтуе ўвагу на тых сацыяльна-бытавых умовах, у якіх адбывалася фармаванне светапогляду паэта, складваліся і праясняліся яго адносіны да рэчаіснасці. Першае, мабыць, што глыбока ўрэзалася ў памяць хлапчука, — гэта выгнанне сям'і з заарандаванага хутара, пагрозы і лаянка пана, бяссільны гнеў бацькі і слёзы маці.

Так рана прыйшло да будучага паэта ўсведамленне поўнага бяспраўя працоўнага люду, так ў сэрцы хлапчука пачалі расці гнеў і нянавісць да прыгнятальнікаў, — тыя гнеў і нянавісць, якія ў хуткім часе з нечуванай сілай выбухнулі ў палымяных песнях-закліках на барацьбу-змаганне за шчасце і волю.

На яркіх прыкладах З. Бандарына паказвае, як агульны лёс збліжае і радніць маладога Купалу з працоўным народам. У хлапчуку-падростку ўгадваюцца рысы будучага паэта, абаронцы прыгнечаных. Аповесць, такім чынам, падводзіць чытача да сацыяльных вытокаў паэзіі Купалы.

Любоўна малюе З. Бандарына вобраз Янкі, раскрываючы яго багатую паэтычную натуру, высакародства душы, шчырасць і прыхільнасць да людзей, прыродную кемнасць і дапытлівасць, яго захапленне народнай творчасцю, яго цягу да ведаў, да навукі. Усе гэтыя рысы маладога Купалы раскрываюцца ў аповесці праз учынкі і дзеянні, пісьменніца пазбягае дэкларацыйнасці. Калі-б да гэтага была дадзена яго партрэтная характарыстыка, вобраз Янкі выступаў-бы яшчэ больш яскрава. На жаль, чытачы не могуць уявіць вонкавы партрэт галоўнага героя аповесці. Толькі ў адным месцы сказана, што гэта быў «невялікі, худзенькі белагаловы хлопчык».

Пераканаўча напісаны раздзелы, у якіх апавядаецца аб няўтольнай прагнасці Янкі да навукі і аб тым, як на яго шляху да святла кожны раз паўставала непераадольная перашкода — беднасць, аб якую разбіваліся ўсе мары пра вучобу.

— Зямля твая навука, не кніга. Кнігі не для нас — для паноў пішуцца, — з горыччу адказвае бацька на просьбу сына навучыць яго чытаць кнігі.

Хаця Янка і закончыў (за адну зіму) Беларуцкае народнае вучылішча, асноўнымі настаўнікамі яго былі жыццё, людзі, з якімі ён спатыкаўся, і кнігі, якіх ён, згодна ўласнага ўспаміну, чытаў вельмі многа і без разбору.

Аўтар імкнецца паказаць на старонках аповесці той свет казак, народных паданняў, легенд і песень, якія, разам з кнігамі, абуджаў фантазію хлапчука, распальваў яго імкненні, акрыляў мары. Як зазначае сам паэт, іменна вусная народная творчасць з'явілася першым яго настаўнікам, першым натхніцелем у дачыненні да паэтычнай дзейнасці. На гэта-ж указваў і Якуб Колас: «Не з тэорыі паэзіі, не з кніжных крыніц чэрпае Купала чары сваёй паэзіі, а непасрэдна бярэ іх з самога жыцця, з назіранняў над ім, з чыстых крыніц народнай мудрасці, з светапогляду свайго народа, з прывабнага харства беларускай прыроды. Гэтыя чары ён чуе ў песнях сваёй маці ў дні маленства, у шуме родных лясоў і гаёў». Народныя песні і паданні пісьменніца стараецца арганічна ўплесці ў тканіну твора і перадае іх звычайна праз успрыйманне героя.

Спрабуе Бандарына стварыць і малюнкі пейзажу, якімі так часта любаваўся будучы паэт. Але гэта ёй не вельмі ўдаецца, і таму словы, накшталт «прыгожая Лагойшчына, дзе праходзіла ранняе маленства Янкі», прыходзіцца ў асноўным прымаць на веру.

«Ой, рана на Івана» — твор біяграфічны. Аснову яго складаюць факты, узятыя з агульнавядомых крыніц — з аўтабіяграфіі паэта, з занісак да аўтабіяграфіі, з успамінаў сястры паэта Леакадзіі Раманоўскай. У той-жа час гэта твор мастацкі, што давала магчымасць аўтару шырока карыстацца домыслам. У асобных раздзелах («Пасля граду», «Сярод лясоў» і інш.) Бандарына і робіць гэта, прычым даволі ўдала. Аднак, на нашу думку, дамысліваць можна было яшчэ смялей. Вобраз Янкі атрымаўся-б больш поўным, твор — цікавейшым.

Аповесць З. Бандарынай мае падзагаловак «Старонкі маленства Янкі Купалы». Тут, здаецца, допушчана недакладнасць. Падзеі ў аповесці даведзены да 1903 года, калі Янка кінуў гаспадарку і пайшоў «цуду» шукаць. У той час яму быў 21 год. Такім чынам, аповесць ахоплівае не толькі гады маленства, але і гады юнацтва. Прынамсі, шэсць апошніх раздзелаў ніяк нельга аднесці да дзіцячых гадоў паэта.

У цэлым аповесць пакідае прыемнае ўражанне. Напісана яна добрай літаратурнай мовай.

Вельмі пахвальна, што З. Бандарына рашылася напісаць твор аб пачатку жыццёвага шляху любімага паэта Беларусі. Кнігу на гэтую тэму даўно і з радасцю прынялі-б чытачы, асабліва моладзь і школьнікі. І дарэчы будзе тут выказаць спадзяванне, што гэтая спроба З. Бандарынай яшчэ раз напомніць нашым літаратарам, гісторыкам, журналістам пра іх доўг перад чытачамі, якія не маюць цікавых мастацкіх біяграфій выдатных дзеячоў беларускай культуры, навукі, літаратуры, удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, герояў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва.

«Полымя» № 12, 1956 г.

Ніл ГІЛЕВІЧ.

Гульня ў чахарду

Клуб шклоўскай папяровай фабрыкі «Спартак» стаіць у старым прыгожым парку непадалёку ад Дняпра. Клапатлівыя рукі рабочых яшчэ пазамінулай восенню пасадзілі тут сотні маладых дрэў, ад якіх сёння засталіся, як кажуць, толькі рожкі ды ножкі.

А здарылася ўсё гэта таму, што на працягу некалькіх год клуб не меў сапраўднага гаспадара, які-б аднолькава сур'ёзна клапаціўся і пра культурны адпачынак рабочых і пра захаванне парку.

Два гады назад тав. Махнач працаваў на фабрыцы шафёрам, сумленна ставіўся ён да выканання сваіх абавязкаў. І калектыў фабрыкі выбраў яго старшынёй фабкома. Але давер'я рабочых тав. Махнач не апраўдаў. У другі раз яго нават не выбралі ў склад праўлення клуба.

І Махнач адразу пачаў атакоўваць партком і адміністрацыю фабрыкі, райком партыі, каб яму пашукалі якую-небудзь кіруючую работу. Хутка тав. Махнача прызначылі загадваць клубам. І пачалася сапраўдная барацьба за права дыктатарства паміж старшынёй праўлення клуба тав. Шкломіным і загадчыкам клуба тав. Махначом. Не было ў іх часу займацца наладжваннем культурна-масавай работы сярод рабочых і членаў іх сямей. Уся ўвага была скіравана на тое, каб зніважыць адзін аднаго, падарваць аўтарытэт. Назначыць адзін рэпетыцыю самадзейнага гуртка, другі абавязкова адменіць. Актыўным памочнікам Шкломіна стаў слесар Харын, дэбашыр і п'яніца.

У выніку — гурткі мастацкай самадзейнасці распаліся. Чытальная зала ўвесь год пуставала. Кніжны фонд бібліятэкі не папаўняўся. У клубе стала няўтульна, пуста, яго адмовіліся наведваць многія рабочыя. Уся работа зводзілася да наладжвання вечароў танцаў.

— Заставалася ў нашым клубе адзінае гасціннае месца — буфет. Там ёсць усё: і сталы, і крэслы, і сумаваць не дадуць, — заявіў на справаздачным сходзе праўлення клуба слесар механічнага цэха фабрыкі «Спартак» М. Касецкі.

Давялося загадчыка клуба тав. Махнача вызваліць ад займаемай пасады. Яго месца заняў тав. Тарасенка, які да гэтага быў старшынёй фабкома і не справіўся з гэтай работай. Клубная работа — адказная і пачэсная справа. І вылучаць на гэтую работу трэба найбольш аўтарытэтных, ініцыятыўных людзей.

Ул. МЯЖЭВІЧ.

Абменныя канцэрты

Быценскі дом культуры быў перапоўнены. Сюды нават не змясціліся ўсе жадаючыя паслухаць канцэрт, які даваў у гэты дзень калектыў мастацкай самадзейнасці суседняга Івацэвіцкага дома культуры.

Разнастайную праграму падрыхтавалі ўдзельнікі самадзейнага калектыву для суседзяў. Адкрыўся канцэрт выступленнем хору. Затым гледачы праслухалі некалькі лірычных песень у сольным выкананні, пазнаёміліся з івацэвіцкімі майстрамі мастацкага слова, танцорамі, цымбалістамі, прагледзелі пастаноўку. Асабліва цёпла былі сустрэты спявачкі медсястра Галіна Савосік і касір Соф'я Рахавецкая, баяніст дырэктар Дома культуры А. Бянько і іншыя артысты.

У гэты-ж дзень у Івацэвічах выступілі самадзейныя артысты Ружанскага дома культуры, якія таксама падрыхтавалі вялікую канцэртную праграму і пастаноўку.

Абменьвацца канцэртамі мастацкай самадзейнасці з суседнімі раённымі дамамі культуры стала ўжо традыцыяй не толькі ў Івацэвіцкім, Ружанскім, але і многіх іншых раёнах Брэсцкай вобласці.

За апошні час калектыў мастацкай самадзейнасці Івацэвіцкага дома культуры даў некалькі канцэртаў у Ружанах, Целяханах, Бярозе, Быцені. Такія выезды практыкуюцца два разы ў месяц. Часта арганізуюцца выезды з канцэртамі і ў навакольныя калгасы.

У сваю чаргу ў Івацэвіцкім доме культуры акрамя ружанцаў выступалі з канцэртамі калектывы Бярозаўскага раённага дома культуры, Сенькавіцкага і Любішчанскага сельскіх клубаў і інш.

Абмен канцэртамі не толькі выклікае цікавасць у гледачоў, але і значна актывізуе работу калектываў мастацкай самадзейнасці. Драматычны калектыў Івацэвіцкага раённага дома культуры рыхтуе пастаноўку п'есы А. Маўзона «Канстанцін Заслонаў», якую таксама пакажа ў суседніх раёнах.

Л. КАРМАЛІТАВА.

Самадзейны скульптар

Некалькі год назад жыхар станцыі Залессе Смаргонскага раёна Аляксандр Жываеў на выстаўцы ў Мінску ўбачыў скульптуры самадзейных майстроў. Яны зрабілі на яго вялікае ўражанне. Некалі ў маленстве ён нядрэнна маляваў, але ў скульптуры ніколі не спрабаваў свае сілы.

Прыехаўшы дадому, Жываеў выляпіў з гліны некалькі фігур. Атрымалася добра. З таго часу ён пачаў кожную вольную хвіліну аддаваць самадзейнаму мастацтву. Напружаная і настойлівая праца прынесла добрыя вынікі. На яго работы звярнулі ўвагу ў абласным Доме народнай творчасці і маладому скульптару часта дапамагалі парадамі і кансультацыямі.

Апошнія работы самадзейнага скульптара «Піонер з голубам міру», бюст В. І. Леніна нядаўна экспанаваліся на Маладзечанскай абласной выстаўцы. Бюст В. І. Леніна набыты для Дзяржаўнага музея выяўленчага мастацтва.

С. Герус. Мінск зімой.

ТРЫБУНА ПІСЬМЕННІКА

Паэзія працы

Адзін знаёмы пісьменнік неяк расказаў мне аб цікавай сустрэчы з студэнтам-дыпломнікам, які вельмі любіць падкрэсліць сваю дасведчанасць ва ўсіх вялікіх і малых праблемах навукі, літаратуры, мастацтва. Але вось прысутныя загаварылі пра Эдуарда Багрыцкага і папрасілі студэнта выказаць сваю думку аб творчай спадчыне паэта. Высветлілася, што малады энцыклапедыст, які ведае ўсё на свеце, нічога не чуў аб паэзіі Багрыцкага. Хтосьці прынёс паэтычны зборнік і раскрыў яго на паэме «Смерць піянеркі». Студэнт з прывычаеным апломбам пачаў чытаць твор так, нібы гэта былі прыпеўкі.

Прысутныя абурыліся, хоць, шчыра кажучы, студэнту трэба было-б і паспачуваць. Хіба-ж не менш за юнака вінаваты і тыя людзі, што вучылі яго ў школе і ў інстытуце, тыя педагогі, літаратуразнаўцы і крытыкі, што многа разважаюць аб эстэтычным выхаванні моладзі, а па сутнасці зводзяць усю справу да пережоўвання сацыялістычных схем.

Мне самому даводзілася не раз гутарыць з людзьмі, што закончылі інстытуты і нічога не ведаюць пра творчасць Хвядоса Шынклера, не чулі пра Міхася Чарота і іншых мастакоў слова, якія займаюць значнае месца ў гісторыі нашай літаратуры. Многае тлумачыцца тым, што мы не маем яшчэ дасканала распрацаванай гісторыі сваёй літаратуры, не бачым нават сур'ёзных спроб прасачыць, як адбывалася паступовае станаўленне метаду сацыялістычнага рэалізма. Ёсць толькі нехітрая схема, якая вандруе з артыкула ў артыкул, з манаграфіі ў манаграфію. Паводле гэтай схемы ўсё, што напісана нашымі пісьменнікамі да кастрычніка 1917 года, поўнасцю належыць крытычнаму рэалізму, а пасля рэвалюцыі нібыта ў адно імгненне перамог і трывала замацаваўся ў гатовым выглядзе метад сацыялістычнага рэалізма.

Такая зручная канцэпцыя вызваляе не аўтараў ад неабходнасці глыбока аналізаваць літаратурныя з'явы і факты, вывучаць асаблівасці пэўных этапаў, адрозніваць сапраўды новае, народжанае ў адказ на патрабаванні самога жыцця, ад усяго старога, непатрэбнага, што адыходзіць або ўжо адышло ў нябыт. Адмаўленне паступовасці ў станаўленні новага творчага метаду прыводзіць да таго, што літаратурная справа перастае быць працэсам і ператвараецца ў нешта застыглае і нязменнае.

Усе гэтыя праблемы тым больш актуальныя, што адкрытыя і замаскаваныя праціўнікі сацыялістычнага рэалізма імкнуцца даказаць, нібыта новы метад не мае глыбокіх каранёў у самой літаратуры і навязаны ёй дэкрэтыўна, зверху. Гэты паклёп абвяргаецца ўсёй гісторыяй савецкай літаратуры, усёй яе практыкай. Сацыялістычны рэалізм выкліканы да жыцця патрабаваннямі рэвалюцыйнай эпохі, калі вырашальнай сілай гістарычнага развіцця стаў рабочы клас як выразнік карэнных інтарэсаў усіх працоўных, а мэтай барацьбы стаў сацыялізм. З гэтага і вынікае ўзаемасувязь паміж новым творчым метадам у літаратуры і сацыялістычнай ідэалогіяй, як ідэйнай асновы гэтага метаду.

Літаратурнай крытыцы трэба больш уважліва вывучаць складаны працэс няўхільнага росту ідэйнай сталасці і прафесійнага майстэрства нашых пісьменнікаў па меры авалодвання імі метадам сацыялістычнага рэалізма.

Мне хацелася-б у гэтым артыкуле прыгадаць адну амаль забытую старонку з гісторыі беларускай савецкай літаратуры. Я маю на ўвазе першыя спробы адлюстравання гераічных спраў людзей рабочага класа, іх штодзённага побыту, іх настойнай працы.

Надзвычай павучальна, што тэма рабочага класа захапіла многіх майстроў беларускай літаратуры якраз тады, калі Камуністычная партыя практычна прыступіла да выканання ленінскай праграмы сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны. Перад краінай Саветаў, якая паспяхова ліквідавала цяжкія разбурэнні двух войнаў — імперыялістычнай і грамадзянскай, — паўстала надзвычай важная гістарычная задача: дабіць капіталізм і эканамічна, пасля таго, як ён быў пераможаны палітычна ў кастрычніку 1917 года. Трэба было выканаць велізарную праграму сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны, а таксама ажыццявіць калектывізацыю сельскай гаспадаркі і на гэтай аснове ліквідаваць кулацтва як клас.

Новыя перспектывы, што адкрываліся перад савецкім народам, вялікі пафас тых гераічных дзён, калі сацыялізм перайшоў у наступленне па ўсяму фронту, — вось тлумачэнне тым яскравым зменам, што назіраліся ў нашай літаратуры, пачынаючы з другой палавіны дваццатых гадоў.

Раней рабочую тэматыку ў беларускай літаратуры распрацоўваў бадай адзін толькі Цішка Гартны. А тут амаль адначасова пачынаюць стварыць вобразы рабочых Кузьма Чорны, Міхась Лынькоў, Ілья Гурскі і многія іншыя беларускія пісьменнікі.

Новым словам у беларускай савецкай літаратуры былі і шматлікія апавяданні Хвядоса Шынклера, прысвечаныя рабочым-чыгуначнікам.

Перш за ўсё і больш за ўсё Хвядоса Шынклера вабіла паэзія працы, захаплялі гераічныя будні рабочага класа. Гэта дапамагала пісьменніку з кожным новым творам рабіць крок наперад у авалоданні метадам сацыялістычнага рэалізма.

А шлях да сацыялістычнага рэалізма ў Хвядоса Шынклера, ды і ў многіх іншых пісьменнікаў, што пачыналі тварыць у дваццатых гадах, быў не такім роўным і простым, як гэта здаецца пасобным гісторыкам літаратуры. Калі нашы крытыкі і літаратуразнаўцы тлумачаць прычыны слабасці ранніх твораў таго ці іншага пісьменніка, уся справа звычайна зводзіцца да аднаго: аўтару, кажуць у падобных выпадках, бракавала прафесійнага майстэрства, навыкаў пісьма. Часта пры аналізе фактаў, з якіх складаецца гісторыя літаратуры, не ўлічваюцца больш грунтоўныя крытэрыі — ступень ідэйнай сталасці пісьменніка, яго ўменне выкарыстоўваць усе магчымасці, што дае літаратару метад сацыялістычнага рэалізма.

Не адразу прыйшло такое ўменне і да Хвядоса Шынклера. Першыя яго творы, пры ўсёй навізне іх тэматыкі, часта яшчэ вызначаліся прывязанасцю да адзінкавага факта, адсутнасцю шырокіх абагульненняў, недастатковай выразнасцю самой ідэі.

Калі-б пісьменнік задаволіўся тым, што было ім дасягнута ў апавяданнях «Апошні рэйс», «Нас зачапіў», «Іча», ён мог-бы ператварыцца ў ілюстратара пэўных тэзісаў ці фатографа, для якога важны вонкавыя адзнакі фактаў і падзей, а не іх унутраная сутнасць. Гэтага не здарылася, бо Хвядос Шынклер уважліва вывучаў заканамернасці жыцця, імкнуўся ва ўсім і заўсёды кіравацца партыйнай ацэнкай новых падзей, падыходзіць да ўсяго з пункту гледжання мастака-рэаліста, які цалкам прысвяціў свой талент справе сацыялізма. Калі да гэтага дадаць патрабавальнасць пісьменніка, яго сціпласць, уважлівасць да слова, тады мы зразумеем, чым тлумачыцца яго хуткі рост, калі ўслед за цэлай серыяй даволі пасрэдных нават для таго часу апавяданняў ён здолеў напісаць творы, якія трывала ўвайшлі ў скарбніцу беларускай савецкай літаратуры.

Нельга цяпер гаварыць аб станаўленні метаду сацыялістычнага рэалізма ў беларускай савецкай літаратуры, а таксама аб павароце яе да рабочай тэматыкі, не прыгадаўшы пры гэтым шынклераўскія аповесці «Сонца пад шпалы», і «Запіскі інструктара Томана». Гэта ўжо даволі шырокія палотны, дзе ёсць і гарачы подых часу, і ўмелае раскрыццё разнастайных чалавечых характараў, і надзвычай цікавыя назіранні мастака, які ўмее пасвойму асэнсоўваць жыццёвыя з'явы. Не маючы магчымасці ў адным газетным артыкуле ўсебакова разгледзець гэтыя творы, мы хацелі-б перш за ўсё адзначыць іх наватарства ў паказе людзей працы. У аповесці «Сонца пад шпалы» выведзена многа прадстаўнікоў рабочага класа, пачынаючы ад кадравых чыгуначнікаў і заканчваючы сезоннікамі, якія прыйшлі на транспарт, каб пэўны час папрацаваць. Асноўную ўвагу пісьменнік аддае рабочаму-вылучэнцу Алесю Дзерашу, якому даверылі пасаду памочніка начальніка ўчастка. Такія пасады раней маглі займаць толькі інжынеры або тэхнікі.

Цяжка было працаваць чалавеку, з якога адсталыя людзі кпілі: «Лапці на семафоры вісяць, не спарахнелі, а ён — на табе, памочнік начальніка ўчастка». Трэба было вельмі многа зрабіць, заваяваць вялікі аўтарытэт, каб нават тая адсталая частка спецыялістаў, якія чапляліся за сваю каставую замкнёнасць, допусціла рабочага-вылучэнца ў сваё асяроддзе і прызнала яго кампетэнтным чалавекам. Варта прыгадаць, што сярод старой інтэлігенцыі ў той час трапляліся і сабатажнікі. Былі яны і ў калектыве, дзе працаваў Алесь Дзераш.

Усё ў гэтай аповесці прасякнута пафасам першай пяцігодкі. З глыбокім веданнем справы паказана нястомная, самаадданая праца першых ударных брыгад, няўхільны рост сацыялістычнай свядомасці людзей. Патрэбны быў цэлы пераварот у свядомасці людзей, каб пад уплывам выхаваўчай работы камуністаў сезоннік Цымончык адважыўся выступіць супраць цёмных махінацый кулака Аніські, які прабраўся на транспарт з мэтай усяляк шкодзіць сацыялістычнаму будаўніцтву. Пад уплывам выхаваўчай работы партыі, пад уздзеяннем рабочага калектыву перайначыўся і некалі апалітычны інжынер Прыстром, які сам сябе лічыў «кабінетным пацуком», «адміністратарам у футарале».

Характэрна, што вобразы рабочага-вылучэнца Дзераша і інжынера Прыстрома ўвесь час развіваюцца ў пэўнай узаемасувязі. Здаецца, дробны факт: Дзераш адкрыта крытыкуе свайго начальніка Прыстрома. Для многіх старых спецыялістаў гэта было нечуванай з'явай, нейкай абразай. Пакрыўдзіўся і сам Прыстром, але, падумаўшы, узважыўшы ўсе акалічнасці, ён пераканаўся, што гэта крытыка здаровая, з ёй нельга не згадзіцца. Ёсць у творы і многа іншых эпізодаў, якія паказваюць, што кожны поспех прадстаўніка новай народнай інтэлігенцыі своеасабліва адбіваўся ў свядомасці Прыстрома, дапамагаў яму лепш зразумець і сутнасць падзей, і пафас калектыву, і шчырасць вялікіх намаганняў рабочых-ударнікаў.

Хвядос Шынклер у сваіх творах «Сонца пад шпалы» і «Запіскі інструктара Томана» пайшоў значна далей у адлюстраванні гераічных будняў першай пяцігодкі, чым, скажам, В. Катаеў у рамане «Время, вперед!». Героі гэтага рамана амаль усю сваю ўвагу засяроджваюць на рэкордах адзіночак, ім здаецца, што варта некалькім ударнікам даць найбольшую колькасць за-

(Заканчэнне на 4-й старонцы)

Шышкін у Беларусі

(Да 125-годдзя з дня нараджэння)

25 студзеня 1957 года спаўняецца 125 год з дня нараджэння вядомага мастака-пейзажыста І. Шышкіна—аднаго з заснавальнікаў рускага рэалістычнага пейзажу.

У свой час крытык В. Стасаў гаварыў пра яго: «Шышкін — мастак народны. Усё жыццё ён вывучаў рускі... лес, рускае дрэва, рускі гушчар... Гэта яго царства, і тут ён не мае сапернікаў».

Валодаючы талентам глыбокага пранікнення ў жыццё прыроды, І. Шышкін напісаў шмат цудоўных пейзажаў і пейзажных кампазіцый. Кожны яго твор—цікавае новае жывапіснае вырашэнне глыбока нацыянальнага рускага пейзажу. Карціны Шышкіна заўсёды насычаны святлом і паветрам, яны ўдала скампанаваны.

Прысвяціўшы сваю творчасць адлюстраванню рускай прыроды і, у прыватнасці, рускага лесу, І. Шышкін заўсёды шукаў і з поспехам знаходзіў і пісаў найбольш цудоўныя куткі яе. З гэтай мэтай ён многа падарожнічаў па неабсяжных прасторах былой Расійскай імперыі.

Быў ён неаднаразова і ў Беларусі, наведаў Палессе, з любоўю вывучаў Белавежскую пушчу. У выніку наведвання Шышкіным Палесся з'явіўся закончаны ў 1883 г. пейзаж «Палессе». На жаль, цяпер у Кіеўскім музеі рускага мастацтва захавалася толькі правая палавіна гэтага пейзажу. Параўнальна нядаўна быў знойдзены ў Маскве і экспанаваны на выстаўцы карцін рускіх мастакоў XVIII—XIX стагоддзяў яго фрагмент, які знаходзіўся ў прыватным зборы.

Апрача гэтага, ў Рускім музеі ў Ленінградзе ёсць чатыры кампазіцыйныя накіды эцюдаў, напісаных Шышкіным у 1882 годзе на гэтую-ж тэму: Пейзаж «Палессе» паказвае дарогу, якая праходзіць каля сасновага лесу.

Параўнальна вялікае месца занялі ў творах Шышкіна карціны, прысвечаныя Белавежскай пушчы. Тут ён жыў і працаваў у пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя. Тады-ж ім быў напісаны рад эцюдаў на тэму аб пушчы: «Ссечаны дуб», «Сухастой», «Буралом», «Пасека» і многа іншых.

У студзені 1893 года ў Пецербургу, у залах Акадэміі, Шышкін нават арганізаваў спецыяльную выстаўку эцюдаў аб Белавежскай пушчы, напісаных у асноўным вясной і летам 1892 года. На выстаўцы экспанавалася да дваццаці эцюдаў, створаных ім у пушчы. Некаторыя з іх—буйных памераў, блізкія да закончаных карцін.

У зборах Дзяржаўнай карціннай галерэі Беларусі ёсць рад карцін гэтага выдатнага рускага пейзажыста: «Дубовы гай», «Сонечны дзень», «У лесе» і інш.

С. ПАЛЕЕС.

Бібліятэка калгаснага пастуха

Калгасніка Міхася Няронскага ведаюць у сельгасарцелі імя Калініна Слуцкага раёна як вялікага кнігалюба. Вось ужо дзесяць год ён нязменна працуе пастухом — улетку пасе грамадскі статак, а ўзімку працуе на малочна-таварнай ферме ў першай паляводчай брыгадзе. Неразлучным сябрам пастуха з'яўляецца кніга. Гонячы статак на пашу, Міхась Селівестравіч не праміне захапіць у сумку томік Якуба Коласа ці Янкі Купалы, газету «Хутчэй Міхась сала забудзе ўзяць, чым кнігу», — гавораць аб ім калгаснікі.

У Міхася Няронскага ёсць свая ўласная бібліятэчка, у якой налічваецца каля двухсот розных кніг: «Малая совецкая энцыклапедыя», творы Я. Купалы, Я. Коласа, В. Маякоўскага, А. Чэхава і многіх іншых пісьменнікаў. Паедзе Міхась Селівестравіч у Слуцк — абавязкова зойдзе ў кнігарню і што-небудзь з мастацкай літаратуры купіць.

Так і назбіралася даволі багатая бібліятэчка. Сам перачытае новую кнігу і суседзям прапануе. Цяпер бібліятэкай пастуха карыстаецца ледзь не ўся вёска Ліпнікі. Аповесць А. Васілевіч «Шляхі-дарогі» перачыталі амаль усе жыхары вёсак Ліпнікі і Таліцы. Аўтар гэтай кнігі — зямляк ліпнікоўцаў, а хто адмовіцца прачытаць аповесць сваёй аднавяскоўкі! На другой старонцы аповесці аўтограф пісьменніцы. «Міхасю Няронскаму, аматару мастацкага слова, ад Алены Васілевіч».

Сёлета Міхась Селівестравіч выпісаў на ўвесь год «Роман-газету», часопіс «Молодая гвардия», «Литературную газету». І хоць не лічыцца калгасны пастух ні ў адзіным спісу агітатараў, а калгаснікі часта звяртаюцца да яго з рознымі пытаннямі. Часам можна ўбачыць, як вакол яго на вуліцы збіраюцца калгаснікі, і пачынаецца гаворка аб міжнародных падзеях, аб навінах па роднай краіне.

Ведаюць у калгасе Міхася Няронскага не толькі як кнігалюба, але і як прыкладнага пастуха. Ен добрасумленна ставіцца да сваіх абавязкаў, у мінулым годзе выпрацаваў больш 600 працадзён.

М. КАЛІНА.

Сустрэча пісьменнікаў з работнікамі пажарнай аховы

У мінулым годзе быў аб'яўлены конкурс на лепшы твор (нарыс, апавяданне, верш), прысвечаны будням і дзейнасці работнікаў совецкай пажарнай аховы. Конкурс праводзіцца Міністэрствам унутраных спраў СССР і праўленнем Саюза пісьменнікаў СССР.

Нядаўна па ініцыятыве Міністэрства ўнутраных спраў БССР і праўлення Саюза пісьменнікаў БССР у клубе пісьменнікаў адбыўся вечар сустрэчы творчых работнікаў з работнікамі пажарнай аховы сталіцы.

Ва ўступным слове палкоўнік А. Сербантаў расказаў аб гісторыі пажарнай аховы рэспублікі. Затым пачаліся выступленні камандзіраў і радавых пажарных. І. Быдзькін расказаў аб тым, як у дзень вызвалення Мінска ад фашысцкіх захопнікаў невялікая група пажарных выратавала ад агню выдатны будынак акруговага Дома афіцэраў. Аб рабоце пажарных расказалі таксама В. Карынец, В. Конік, П. Собкін і іншыя. Затым выступілі пісьменнікі М. Калачынскі, Я. Садоўскі, А. Міронаў, Э. Агняцвет.

У заключэнне былі паказаны кінофільмы, якія расказваюць аб рабоце совецкай пажарнай аховы.

Барыс МІКУЛІЧ

Звычайны дзень

АПАВЯДАННЕ

У 1931 годзе ў кнігарнях Беларусі з'явіўся зборнік апавяданняў пад назвай «Удар». Аўтарам яго быў дзевятнаццацігадовы беларускі празаік Барыс Мікуліч.

У тым-жа годзе выйшаў другі зборнік апавяданняў Б. Мікуліча «Чорная Вірня», амаль цалкам прысвечаны паказу жыцця вясковай моладзі ў першыя гады калектывізацыі.

У 1932 годзе з'явілася аповесць Барыса Мікуліча «Наша сонца». Кіпучае жыццё комсамола ў гады першай пяцігодкі шырока паказана на яе старонках.

У тым-жа годзе выйшла з друку новая аповесць Мікуліча «Ускраіна», прысвечаная будаўніцтву буйнага дрэваапрацоўчага камбіната, сувязям рабочых-будаўнікоў з калгаснаю вёскаю. Два выданні вытрымала аповесць «Дужасць», якая ўпершыню выйшла ў 1934 годзе. Яшчэ праз год пісьменнік выдаў кнігу навел «Яхант» — пра гераізм совецкіх людзей на франтах грамадзянскай вайны.

У 1935 годзе Барыс Мікуліч разам з групай беларускіх пісьменнікаў наведаў Совецкую Грузію, а ў 1936 годзе выйшла яго новая аповесць «Дружба». У ёй ужо адчуваецца творчая сталасць маладога пісьменніка, паглыбленае пранікненне ў жыццё братняга народа. Ен паказвае шчырую дружбу многанацыянальнай сям'і совецкіх народаў, перад якімі раскрыта вялікая будучыня.

Барыс Міхайлавіч Мікуліч нарадзіўся ў 1912 годзе ў г. Бабруйску, у сям'і фельчара. Скончыўшы сярэднюю школу, ён пачаў працаваць у рэдакцыі бабруйскай акруговай газеты «Комуніст». На старонках газеты, у літаратурным дадатку «Вясна», у альманаху «Уздым» і ў рэспубліканскіх часопісах «Маладняк», «Полымя», «Чырвоная Беларусь» пачалі з'яўляцца апавяданні Барыса Мікуліча.

У 1931 годзе ён пераехаў у Мінск і актыўна ўключыўся ў літаратурнае жыццё рэспублікі. Асабліва вялікую ўвагу аддаваў Б. Мікуліч комсамольскай рабоце, жывучы клопатамі і хваляваннямі сваіх равеснікаў, якія станавіліся героямі яго кніг.

17 чэрвеня 1954 года Барыс Мікуліч памёр.

Сяргей ГРАХОЎСКІ.

1.

У нашай вёсцы ўсё дзяўчаты невялікага росту, танклявыя. Калі прыдумлялі параўнанне дзяўчат з белымі бярозкамі, дык мелі на ўвазе якраз нашых. Што да мяне і маіх землякоў-хлапцоў, дык мы можам цалкам лічыць сябе прыхільнікамі іменна той часткі жаночага роду, якая вызначаецца невялікім ростам, зграбнасцю стану, лёгкасцю хады, тонкімі рысамі твару і блакітным агнём вострых вачэй. Адным словам, я любуюся дзяўчатамі нашай вёскі, хоць і нарадзілася тут — сярод іншых — пякучая прымаўка: «З гэтага гурту выбяраш курту...» Калі хто з не нашых і ўспамяне гэтую прымаўку ў адказ на маё выхваленне тутэйшых дзяўчат, дык я заўсёды гатовы адказаць на кпін чужога чалавека мудрымі словамі нашай старой цёткі Паланеі. Калі аднаго разу нейкі прэнткі чалавек пакпіў з адной дзяўчыны, што яна — курта, дык цётка Паланея рэзонна суцешыла дзеўчыну:

— Лепш малая ды зграбная, чым вялікая ды чапяла...

Дык пра тую дзяўчыну, пра якую я маюся вам пахваліцца, карыстаючыся свяшчэнным правам абарыгена, якраз і трэба паўтарыць тое, што я кагадзе казаў пра нашых вясковых дзяўчат: Ніна Краўчанка (у нас палова сяла Краўчанкі) была невялікага росту, зграбная, быстрая на ногі, залаціставалосая і блакітнавокая. Для адных — не горшая і не лепшая за астатніх дзяўчат, для другіх — найлепшая і найадзіная... Толькі яшчэ нядаўна яна нават і не здагадвалася, што ці знойдзецца ў цэлым свеце хоць адзін чалавек, якога можна было-б паставіць у гэтую другую катэгорыю. Ніна была ўпэўнена бадай ад самага свайго нараджэння, што яна звычайная дзеўка, радавы, так сказаць, звычайны чалавек. Але ў яе быў цвёрды кірунак у жыцці, такая рыса характару, якая якраз і вылучыла яе з шэрагу аднагодак. Але раней чым расказаць пра гэтую асаблівасць нінінага характару, дазвольце некалькі слоў сказаць пра наш калгас, назва якому «Радзіма». Дзве невялікія вёскі, адна з іх была ўся чыста выпалена немцамі, а другая — толькі напалову. Адзін край, што ад ракі да старой ліпы, якая тут стаіць можа сто гадоў, бо самыя старыя нашы помняць з маленства гэтую ліпу і тое, як пра яе казалі, што яна старая ліпа... дык вось гэты край вёскі, хат восем, уцалеў, а астатняе — пайшло з дымам. Праўда, цяпер і «Радзіма» адбудавалася, а яшчэ нядаўна тут былі зямлянкі. Знаходзіцца наш калгас побач з мястэчкам — раённым цэнтрам. Паміж мястэчкам і вёскай ляжыць рака, звілістая і ціхая, потым сенажаць, а там старыя прысады і такі-ж стары парк, праз які трыццаць гадоў мы смела ходзім у мястэчка. Гэта добра, што наш калгас блізка ад цэнтра—і навін не трэба доўга чакаць, і на дапамогу раённых арганізацый можна часцей разлічваць, і рынак блізка, і бальніца... Адным словам, добра. Але ёсць і нешта адмоўнае, такое, што — хоць і дробязь, але трохі замінала аднаўленню нашага калгаса. Вайна, як вядома, пакасіла нямала людзей. У сяле асталіся старыя ды падлеткі. Апошнія за гады вайны падняліся. У мястэчку — таксама нястача работнікаў. Ну, а раз наша вёска пад бокам, дык ясна, што моладзь пацягнулася ў мястэчка — хто ў майстэрню, хто ў якую ўстанову, хто ў пільню. А ў калгасе зноў асталіся пераважна старыя ды паджылыя. Ды трохі дзяўчат, сярод якіх і Ніна.

Разам з ёю вырас Косцік Краўчанка, тых самых Краўчанкаў, чыя хата стаіць над самай ракой, вялікая хата, але ўжо бярвенне пачарнела ад часу. Гэтыя Краўчанкі, косцікавы бацькі, не гарэлі. Рос Косцік, як і ўсе. Да вайны вучыўся ў мястэчку, у вайну дапамагаў партызанам, аж покуль і самому не давялося ісці ў лес. З падлетка стаў юнаком. Аднаго разу, на вечарынцы, наскакаўшыся ўволю і адпачываючы на лаве, Ніна глянула на яго і аж здзівілася: русы чуб лёг на асмужаны лоб зацейлівым кудзерам, у моцных белых зубах дымціць цыгарка, смяецца голасна, і сінія вочы — з агнём. Упершыню Ніна ўбачыла, што перад ёю — ужо не той, што рос побач, а мужчына. Трапяткая яе рука лягла на шырокую хлапечую спіну, абцягнутую сінім фрэнчам, калі зноў пайшлі яны танцаваць. І дзве пары вачэй — светлаблакітных і цёмнасініх — сышліся блізка, і агні сініх гаслі ў блакіце дзявочых... А потым... Потым рог месяца плаваў у рачной хвалі, і вокунь, выплываючы з глыбіняў, важыўся схапіць срабрыстую прынаду, і месяц драбіўся ў бліскучыя зерні...

— Рыба гойсае, — сказаў Косцік.

— Але... — казала Ніна.

Яны так увесь час і гаварылі не пра тое, што трэба, пра што хацелася, а выходзіла, што іх надта цікавіць паляванне вокуня за месячным рогам і тое, як падаюць зоры, і тое, як свеціць за курганам, на тым беразе ракі, неба, быццам водблеск далёкага пажару... Яны разышліся ў тую ноч, не сказаўшы, што любяць адзін аднаго, але абое думалі пра гэта. І так яны сыходзіліся, і вясковае «радыё» злучыла іх у пару, а адзін з добраахвотных «радыёкаментатараў» заўважыў якраз: «З нашага гурту выбраў Косцік курту...»

А лета ішло, вы-ж ведаеце, якое дружнае. Жыта паднялося сцяной, вось-вось пачне каласіцца. Хадзілі на сена. Косцік— з касой, Ніна — з граблямі. Увечары, калі вярталіся з сенажаці, Ніна адставала ад сяброўак і бегла на свой участак — паглядзець, як расце жыта. І тут, каля капца чамусьці заўсёды сядзеў Косцік і курыў.

— Нешта... бот, мусіць, намуляў... Прыйшлося адстаць... — кожны раз казаў ён з усмешкай.

І тады яны ішлі ў вёску разам і пад ліпай разыходзіліся — ён у адзін канец, яна ў другі. Прыходзіла дахаты Ніна хоць трохі і змораная, але вясёлая. Хата ў іх — новая, светлая. Бацька — ключнік, станавіты мужчына, паважаны. Ён не ў прыклад Пілішу, які быў да яго ключнікам, добрасумленны чалавек і разумее, што калі не пойдзе касіць з усімі мужчынамі, дык неяк і няёмка потым будзе глядзець ім у вочы, тым больш, што ў свірні і ў каморах цяпер пуставата. І з бацькам у Ніны не было сакрэтаў. Часта казала дачка да бацькі:

— Ты-б ажаніўся, татусік.

А ён ёй у адказ:

— Раней, можа, ты, дачушка... Вот Косцік...

— Ну, што Косцік... — пярэчыла дачка, а сэрца соладка ёкала. — Ен... яму яшчэ ў арміі служыць...

І так яны жылі ўдваіх — бацька і дачка, і асноўнае ў іхнім жыцці было — калгас.

— Цяжка нам паднімацца. Людзей мала, а маладыя ўсё больш у мястэчка, — часта казаў бацька, і Ніна цалкам згаджалася з ім, што гэта не вельмі добра, калі моладзь мяняе калгас на ўстанову ці майстэрню. А бацькава заклапочанасць пра тое, што «Радзіму» трэба ўзняць вышэй, была і нінінай заклапочанасцю. І надумалася яна гаспадарчы год скончыць як след, у жніво паказаць, што дзявочая брыгада — не горшая за брыгады іншых калгасаў, якія ідуць у раёне першымі. А лета ішло, зоры падалі, і ў жніўні запахла паветра спелым зернем.

І аднаго разу надыйшло непрадбачанае.

— Ніна, — сказаў Косцік, устаючы з капца. — Паслухай... Давай... ажэнімся. Будзем жыць у мястэчку, мне там добрую пасаду даюць... А ты... як хочаш, альбо будзеш вучыцца, альбо ў ашчадкасу пойдзеш рабіць...

Стаяў і чакаў — радаснай згоды.

— Жніво... — сказала яна. — Не, я ў мястэчка не паеду.

— Падумай.

— Думала.

Разышліся. Яна адна пайшла дахаты. Але ў тую ноч не спалася. Няўжо пойдзе і Косцік рабіць у мястэчка? Было горача ў хаце. Ціха, каб не пабудзіць бацьку, пайшла на двор. Аксамітная ноч. Ніна сядзела на камені, што здаўна ляжаў на аселіцы. Пойдзе — не пойдзе? Бралася на дзень. Калі ўжо стала светла, але яшчэ не ўзышло сонца, Ніна бачыла густы туман над ракой, і дрэвы, што раслі на тым беразе, былі як-бы без ствалоў, толькі кроны пакоіліся на тумане... Потым сонца ўзышло, туман над ракой знік, але не знік ён з дзявочага сэрца... Першы яркі прамень страліў з-за воблака, і агні прабеглі па зямлі... І ад іх заблішчала ўсё навокал яркімі, сакавітымі фарбамі — сенажаць, устаўленая стагамі, жытнёвае поле — зялёна-жоўтае бяскрайняе мора... І жаўрук заліўся песняй.

— Не! — сказала дзяўчына. — Хіба я магу кінуць гэта?

Хоць і спадзявалася яна, што Косцік перадумае, але ён пайшоў у мястэчка і там стаў на працу.

2.

У мяне была вельмі лёгкая роля на гэты раз: нікога не трэба было падганяць, нікога не трэба было пераконваць, што трэба карыстацца пагодай і што калгаснае поле — гэта спярша, а свая сядзіба — пасля. За мяне гэтую работу зрабіла ў «Радзіме» брыгада Краўчанкі. Аднаго разу ўвечары, калі мы з ёю былі ў хаце ўдваіх, Ніна дастала з пальціка стопку газетных выразак і падала іх мне. Я ўзяў іх у рукі, не разумеючы, праўда, навошта мне гэтыя старыя газетныя шматкі.

— Пачытайце...

Я пачытаў. Я ўжо ў свой час чытаў гэтыя допісы пра тое, як у адным калгасе знатная вязальшчыца паставіла рэкорд — 10.000 снапоў за дзень.

— Цікава, — сказаў я. — Але нашы жанчыны прызвычаіліся жаць па-старому — кожная сабе. Іх гэтым не возьмеш.

— А вы мне дапамажыце. Жняярка ў нас на рамонце... з вясны. Мы памеркавалі з падругамі і хацелі-б паспрабаваць. Жняярка пройдзе тры-чатыры разы, а нас трое, мы нарыхтуем перавясел, двое падраўнуюць радок, а я пайду вязаць. Быць не можа, каб не асіліць.

Раніцай я быў у раёне, адшукаў рамонтную майстэрню і тут якраз і сустрэўся з Косцікам Краўчанкам. Я якраз і выкарыстаў тое, што ён — не чужы, а свой, з «Радзімы». Ен адшукаў у тоўстай пачцы нарад на рамонт жняяркі і абяцаў «прасунуць». Ен такі і «прасунуў» і, калі жняярка была агледжана і я забіраў яе з майстэрні, Косцік між іншым сказаў:

— Ну, як там?.. Вы дзе на кватэры?

— У Краўчанкі.

— У якога? У ключніка?

— Ну.

Ен глянуў мне ў вочы. І я глянуў. Я люблю глядзець людзям у вочы і люблю бачыць у іх агні. Вочы без іх мне не падабаюцца. Агні ў зрэнках — гарачая кроў у целе.

— Перадайце... паклон.

— Ніне?

Ен кіўнуў.

І вось жняярка пайшла. Бабы казалі, што зглуміць жыта, але мы іх не слухалі. Ніна, Каця і Волька, тры комсамолкі, вязалі перавяслы і клалі іх на полі. Потым Ніна ад іх адстала, трохі адпачывала. Жняярка прайшла поле тры разы і пайшла чапвёрты. Ею кіраваў наш трактарыст Алёшка, пра якога казалі, што ён на трактары і днюе і начуе. Ен згадзіўся выехаць, бо, прызнаваўся пазней, хацеў мець права пажалець гэтай Нінцы ў вочы. Алёшка быў прыяцель з Косцікам і таму блізка прымаў да сэрца нінін разрыў з Косцікам. І вось Ніна пайшла, нахіліўшыся над зжатым жытам, закідаючы снап на руцэ. Пайшла, пайшла. Яе зграбная гнуткая постаць аддалялася. Я сачыў за ёю, і мне раптам здалося, што яна ўсім растала ў гэтым суцэльным сонцы, якое запаланіла сабой увесь свет. Я пайшоў на другі ўчастак, дзе працавалі жнеі. Над полем плыла песня — павольная, спакойная, падмацоўваючы сабой суладжанасць працы і ўстойлівасць традыцыі. Потым іншыя клопаты захапілі мяне, і да Краўчанкі я трапіў толькі пад вечар. Насустрач мне капіўся каржакаваты Трахім Сяргеевіч, старшыня. А жняярка стракатала недзе ўжо на выгане.

— Ну як? — спытаўся я.

— Сем тысяч сто трыццаць дзевяць. Добра!

Вядома, гэта было добра. Але Ніна, якую я сустраў у хаце, не падзяляла гэтага погляду. Яна была і стомлена, і разгублена. На мае роспыты яна сказала адно:

— Ведаеце... у мяне быў такі момант, што я траха не кінула ўсё і не пайшла... Але я дала слова.

— Выпрацоўка ў цябе, Ніна, вельмі добрая. Я пайду, пазраню ў райком.

— Паслухайце! — яна кранула мяне за руку. — Калі можна, не званіце. Сем тысяч, гэтага мала. Я дала слова...

— Каму?

— Сабе.

І потым яна давала два дні амаль адну і тую-ж выпрацоўку: восем тысяч дзвесце. На чацвёрты дзень выпрацоўка была такая-ж, і яе можна было лічыць стабільнай. І такая — яна была грандыёзнай для нашай вёскі. Жанчыны прыходзілі, мацалі снапы, разглядалі іх, быццам чакалі, што чаго добрага яны рассыплюцца, разбягуцца па полі. Снапы былі добрыя, мерныя, перавяслы — моцныя. На пяты дзень — гэта было ў нядзелю і многія са жней не выйшлі ў поле — я вымушаны быў пайсці ў суседнюю вёску, каб пераканаць набожных выйсці на працу хоць з поўдня. Тут я і затрымаўся да вечара. А калі вярнуўся, мяне сустрэла навіна, якой і я здзівіўся.

— Тройка наша, га? — шумеў старшыня. — Адзінаццаць тысяч трыста сем снапоў!

Цяпер без дазволу Ніны я паведаміў аб рэкордзе Краўчанкі ў райком. А позна ўвечары, калі ўсе, хто прыходзіў, пакінулі хату, я спытаўся ў стаханаўкі:

— Ніна... Такі ўдалы дзень! — Я хацеў яшчэ дадаць: — Гэты дзень для цябе — шчаслівы. Заўтра рэспубліка будзе ведаць пра твой подзвіг.

Яна адказала:

— Удалы дзень? Дзень звычайны. Проста... я ўжо не тамлюся. Я першыя дні ўсё спяшалася. Рвану, рвану, астыну. А сёння пайшла, пайшла... І ведаеце... тут Каця заспявала, я заслухалася... Так, гэта было добра... Можна даць дванаццаць тысяч. На аўсе мы дадзім.

У голасе была ўпэўненасць.

Дык вось якія ў нашым маленькім калгасе «Радзіма» дзяўчаты, пра якіх вы цяпер прачыталі ў газетах. Хоць і невялікага росту, але лёгкай хады, з тонкімі рысамі твару і з блакітным агнём у вачах. Яны калі даюць сабе слова, дык гэта тое-ж самае, што абяцаюць партыі і ўраду. Іхняе слова цвёрдае. Абсалютна ва ўсім. І яшчэ я вам скажу пра Ніну адну драбязу, пра якую вы не маглі прачытаць у газеце. Косцік-такі зноў прыйшоў да яе і спытаўся — ці не перадумала яна. І яна...

Я заўважаю вашыя ўсмешкі на тварах. Ну, ясна, хочаце сказаць вы, Ніна горда глянула на свайго жаніха і сказала: не перадумала. Не, не спяшайцеся. Прыязджайце лепш да нас у «Радзіму» на вяселле. Выдаём нашу Ніну за нашага Косціка. Яна сказала яму:

— Не перадумала, але як я цябе чакала, Косцік!

Прыязджайце. У нас ёсць і апрача Ніны дзяўчаты. Як глянеце ў іхнія вочы— на гэтым вам і канец. Агонь у вачах. Гэта пра нашых дзяўчат сказалі — белыя бярозкі...

29. XII. 1947 г.

Паэзія працы

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

месаў бетона — і гэтым калектыў будоўлі вырашыць усе свае задачы. Такая-ж, прыкладна, гульня ў рэкорды па сутнасці нашкодзіла аповесці П. Броўкі «Каландры». Хвядос Шынклер больш правільна і глыбока зразумеў сутнасць тагачаснага этапа соцыялістычнага спаборніцтва. Яго героі ўсведамляюць асабістую адказнасць не толькі за выкананне свайго вытворчага задання, але і за лёс усяго пяцігадовага плана ў цэлым.

Хвядос Шынклер раскрыў самую сутнасць спаборніцтва, паказаў яго масавасць, яго мэтанакіраванасць.

Пісьменніка надзвычай цікавіла ўсё, што так ці інакш звязана са стаўленнем людзей да працы, з выхаваннем новых адносін да грамадскага абавязку. Хіба не павучальна, што, выпусціўшы ў 1933 годзе ў свет буйны твор («Сонца пад шпалы») пра нараджэнне масавага руху ўдарнікаў у асяроддзі рабочых, Хвядос Шынклер праз год прапануе ўвазе чытача новую аповесць, у якой паказаны вялікі рост людзей у працэсе соцыялістычнага спаборніцтва? Пра гэты факт, мне здаецца, варта напомніць тым літаратарам, якія лічаць, што пісаць можна толькі пра падзеі і факты, якія ўжо ўстаяліся і сталі гісторыяй, гэта значыць, тады, калі новая з'ява перастае быць новай. А літаратура, акрамя ўсяго іншага, абавязана прыкмячаць і падтрымліваць парасткі новага, прапагандаваць іх, а не плесціся ў хвасце падзей.

Мабыць, гэтай арыентацыяй некаторых пісьменнікаў на ўчарашні дзень і тлумачыцца той непрыемны факт, што за апошняе дзесяцігоддзе ў нас напісана вельмі мала твораў, прысвечаных рабочаму класу рэспублікі. Прайшло не так мала часу пасля з'яўлення аповесцей «Цёплае дыханне» М. Паслядовіча і «Гартаванне» А. Кулакоўскага. А што прыбавілася пасля гэтага? Можна назваць некалькі добрых апавяданняў І. Грамовіча, такіх, як «Запаветны камень», «Да ясных вышыняў». Першае з іх прысвечана маладому пакаленню рабочага класа, другое трактуе тэму братэрскай дружбы працаўнікоў горада і вёскі. Некалькі цікавых твораў ёсць у А. Чарнышэвіча, які ўмее па-свойму свежа і арыгінальна пісаць аб тым, як становіцца кадравым рабочым учарашні селянін, які дагэтуль нічога, акрамя сваёй вёскі, не бачыў. Лепшымі з гэтых твораў А. Чарнышэвіча, на маю думку, з'яўляюцца апавяданні «Лясная быль» і «Затор на дваццатым». У часопісе «Полымя» ў свой час была апублікавана аповесць Ул. Дадзіомава «Над Нёманам». Зрэдку паяўляюцца апавяданні І. Гурскага аб людзях соцыялістычнага горада. Амаль цалкам прысвяціў сваю творчасць паказу штодзённай працы рабочых Я. Васілёнак.

Нават колькасна гэта надзвычай мала для шматлікага пісьменніцкага калектыву рэспублікі, не гаворачы ўжо аб тым, што па шырыні ахопу падзей, па глыбіні іх адлюстравання творы на рабочую тэматыку стаяць ніжэй за кнігі, скажам, аб калгаснай вёсцы.

Аўтар гэтых радкоў нароўні з многімі іншымі крытыкамі вінаваты ў тым, што новыя творы пра жыццё і працу рабочых у нас нярэдка яшчэ сустракаюцца непрыхільна. Яўна недаацэнены былі аповесці «Цёплае дыханне» М. Паслядовіча і «Гартаванне» А. Кулакоўскага. Больш рашуча можна было-б падтрымаць маладога пісьменніка Ул. Дадзіомава, які прысвяціў свой першы буйны твор стваральнікам новай для Беларусі галіны прамысловасці. Справа не ў тым, каб амнісціраваць творчыя промахі і недахопы. Патрабавальнасць да мастацкіх твораў заўсёды павінна быць высокай.

Трэба па-гаспадарску ацаніць усё тое, што напісана нашымі пісьменнікамі аб рабочым класе рэспублікі. Добрыя традыцыі варта ўсяляк прапагандаваць і падтрымліваць, ад усяго аджылага, устарэлага — адмовіцца. Калі мы гэта зробім, чытач з вялікай удзячнасцю адкрые для сябе нанава многія незаслужана забытыя творы Цішкі Гартнага, раннія апавяданні Кузьмы Чорнага, прысвечаныя рабочым, перастануць быць бібліяграфічнай рэдкасцю першыя зборнікі Хвядоса Шынклера.

Трэба, каб масавы чытач, нарэшце, атрымаў поўны збор твораў Хвядоса Шынклера, навукова абгрунтаваную манаграфію, прысвечаную гэтаму самабытнаму пісьменніку. Хацелася-б, каб у нас было сказана важкае слова аб значэнні творчай спадчыны Хвядоса Шынклера, аб тых прынцыпова важных традыцыях, у распрацоўцы якіх ён актыўна ўдзельнічаў разам з К. Чорным, М. Лыньковым і іншымі беларускімі пісьменнікамі. Гэтыя традыцыі могуць саслужыць нам добрую службу і сёння, калі Комуністычная партыя патрабуе, каб наша літаратура больш рашуча павярнулася да людзей працы, лепш адлюстроўвала героіку пяцігодак, прапагандавала сродкамі мастацкага слова вялікія поспехі, з якімі народ наш ідзе да 40-годдзя Совецкай улады.

Няхай нас не зразумеюць так, быццам мы заклікаем нашу літаратуру вярнуцца назад, да ранніх твораў К. Чорнага, да апавяданняў і аповесцей Хвядоса Шынклера, напісаных два дзесяцігоддзі таму назад. Узровень у нашай літаратуры цяпер зусім іншы, іншымі сталі запатрабаванні самой эпохі, густы чытача. Узяць у Хвядоса Шынклера трэба яго ўважлівасць да ўсяго новага, яго любоў да людзей працы, яго паслядоўнасць у адстойванні сваіх творчых прынцыпаў, яго вернасць жыццёвай праўдзе. Усяму гэтаму літаратурнай моладзі ў Хвядоса Шынклера варта вучыцца.

Я. ГЕРЦОВІЧ.

ХРОНІКА КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ

ЛІТАРАТУРНЫ ВЕЧАР НА НЯМЕЦКАЙ МОВЕ

Днямі школьны клуб рускай сярэдняй школы ў Глуску запоўнілі выкладчыкі нямецкай мовы сярэдніх і сямігадовых школ раёна, вучні старэйшых класаў. Яны сабраліся на літаратурны вечар, прысвечаны вялікаму нямецкаму паэту Генрыху Гейнэ.

З дакладам на нямецкай мове аб жыцці і творчасці Г. Гейнэ выступіла вучаніца дзесятага класа В. Меяровіч.

Пасля быў дадзены канцэрт вучнёўскай мастацкай самадзейнасці—таксама на нямецкай мове. Былі выкананы вершы і песні нямецкіх паэтаў і кампазітараў, а таксама вершы рускіх паэтаў, перакладзеныя на нямецкую мову.

С. ШУМОЎСКІ.

У РЭПЕРТУАРЫ — БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ТАНЦЫ

Самадзейны танцавальны калектыў калгаса «Парыжская Комуна» Ашмянскага раёна за апошні час развучыў і паставіў многія беларускія народныя танцы.

Нядаўна танцавальны гурток разам з харавым калектывам калгаса даў канцэрт хлебаробам Смаргонскага раёна. На сцэне клуба сельскагаспадарчай арцелі імя Хрушчова з поспехам выступалі маладыя калгасніцы Я. Сульжыцкая, Л. Валейня, Г. Травіцкая, С. Жабынская, М. Валейня і іншыя. Яны выканалі беларускія народныя танцы «Крыжачок», «Мяцеліца», «Бульба», «Лявоніха» і «Лянок».

І. КАВАЛЬЧУК.

САТЫРЫЧНАЯ ГАЗЕТА «НАШ ВОЖЫК»

Совет Кіраўскай хаты-чытальні Бялыніцкага раёна выпускае сатырычную газету «Наш вожык». Па фактах, аб якіх паведамляе газета, прымаюцца адпаведныя меры.

А. ПЛІНДАЎ, настаўнік.

РАДЫЕФІКАЦЫЯ КАЛГАСАЎ

У мінулым годзе Парыцкая раённая кантора сувязі радыёфікавала пяць калгасаў. У дамах калгаснікаў сельскагаспадарчых арцелей імя Молатава і «Перамога» ўстаноўлена звыш 800 радыёкропак.

І. СТЭЛЬМАХ, супрацоўнік раённай канторы сувязі.

З КАНЦЭРТАМІ У ВЕСКУ

Калектыў мастацкай самадзейнасці Мірскага дома культуры Карэліцкага раёна падрыхтаваў для калгаснікаў новую канцэртную праграму, з якой выступіў перад рабочымі і механізатарамі Обрынскай МТС, а таксама ў калгасах імя Леніна і імя Чэрняхоўскага.

М. ПОЗНЯК.

НА ІНСТЫТУЦКАЙ СЦЭНЕ

У Гродзенскім педагагічным інстытуце адбыўся вечар, прысвечаны 150-годдзю з дня нараджэння Дуніна-Марцінкевіча. З дакладам аб жыццёвым і творчым шляху пісьменніка выступіла студэнтка тав. Нерад. Вечар закончыўся спектаклем па п'есе Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта», падрыхтаваным сіламі драматычнага гуртка.

І. СУХОЦКІ.

Галоўны рэдактар Мікола ТКАЧОЎ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Янка КАЗЕКА (намеснік галоўнага рэдактара), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (адказны сакратар), Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у сераду і суботу.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва—3-24-62, аддзела культуры—3-21-53.

АТ 03712

Друкарня імя Сталіна.